В. Х. СЕРАДЗІНСКАЯ

# ЧАЛАВЕК І СВЕТ 3

Частка 2



# Разнастайнасць жывёл

## Насякомыя



## Рыбы



## Жабы і рапухі



## Яшчаркі і змеі



## Птушкі



## Звяры



# Рэжым дня



7:10



7:20



7:35



9:00



13:00



13:30



15:00



16:30



19:00



19:30



20:30



21:30

# Чалавек-працаўнік







# Вырабы

## Мэбля



## Посуд



## Цацкі



## Транспарт



## Адзенне



## Абутак



## Галаўныя ўборы



## Інструменты



В. Х. Серадзінская

# ЧАЛАВЕК І СВЕТ

Вучэбны дапаможнік для 3 класа
спецыяльных школ, спецыяльных школ-інтэрнатаў
з беларускай мовай навучання і выхавання

У дзвюх частках

Частка 2

*Дапушчана*
*Міністэрствам адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

Мінск
Нацыянальны інстытут адукацыі
2022

Правообладатель Национальный институт образования

УДК 502(075.2=161.3)-056.313
ББК 74.3
С32

Р э ц э н з е н т ы:

кафедра педагогікі і псіхалогіі пачатковай адукацыі факультэта пачатковай адукацыі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка» (дацэнт кафедры, кандыдат педагагічных навук, дацэнт *А. Г. Сарока*);

настаўнік пачатковых класаў вышэйшай катэгорыі дзяржаўнай установы адукацыі «Вілейская спецыяльная агульнаадукацыйная школа-інтэрнат» *А. В. Буцько*

## Умоўныя абазначэнні

 — пытанні і заданні перад чытаннем тэксту;

 — новыя словы. Чытаем іх па складах і цалкам. Прагаворваем услых і пра сябе. Удакладняем значэнне. Складаем словазлучэнні і сказы;

 — работа ў парах (моўныя і лагічныя практыкаванні);

 — работа ў групах (вопыты, назіранні, практычныя заданні);

 — пытанні і заданні для паўтарэння і замацавання. Больш складаныя пытанні і заданні пазначаны зорачкай (*);

 — заданні для пазаўрочнай работы;

 — дадатковы матэрыял. Яго неабавязкова вывучаць усім вучням. Гэта тэксты для дапытлівых.

Памятайце, што пасля вас вучэбным дапаможнікам будуць карыстацца іншыя вучні. Беражыце яго.

**ISBN 978-985-893-250-3 (ч. 2)**
**ISBN 978-985-893-248-0**

© Серадзінская В. Х., 2022
© Афармленне. НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі», 2022

Правообладатель Национальный институт образования

Змест

## ЖЫВАЯ ПРЫРОДА І ЧАЛАВЕК
## (працяг)

**Жывёлы — частка жывой прыроды** ....... 5
Разнастайнасць жывёл .................... 5
Насякомыя ............................... 8
Рыбы .................................... 10
Жабы і рапухі ........................... 12
Яшчаркі, змеі, чарапахі ................. 15
Птушкі .................................. 19
Звяры ................................... 23
Расліннаедныя звяры ..................... 27
Драпежныя звяры ......................... 29
Усёедныя звяры .......................... 32
У прыродзе ўсе важныя, усе патрэбныя .... 35
Свойская жывёла ......................... 37
Небяспечныя жывёлы: каго баяцца ......... 40
*Пагаворым пра жывёл. Разважайце, расказвайце* ................................. 44

**Чалавек — частка жывой прыроды** ....... 46
Клопат пра здароўе і бяспеку ............ 46
Рэжым дня ............................... 49
Харчаванне і здароўе .................... 52
Зубы, іх догляд ......................... 54
Як папярэдзіць хваробы .................. 57
Хто такія паразіты ...................... 60



Правообладатель Национальный институт образования

Чым карысны адпачынак на прыродзе.
Чаго баяцца ........................................ 63
*Пагаворым пра здароўе і бяспеку. Разважайце, расказвайце* ........................... 67

ЧАЛАВЕК — ЧАСТКА ГРАМАДСТВА

**Чалавек-працаўнік. Правілы паводзін у грамадскіх месцах** ........................ 68
На будоўлі ........................................ 68
Праца гараджан на фабрыках і заводах ... 72
Праца сельскіх жыхароў на палях ........ 75
Хто такія жывёлаводы ........................ 80
Магазіны. Дзе і што мы купляем .......... 83
Дзе можна адпачыць у выхадны дзень .... 86
У бібліятэцы ........................................ 89
Мы — пасажыры ................................ 92
У паліклініцы, бальніцы ...................... 95
На пошце ............................................ 97
Дзе і што мы ядзім .............................. 100
Служба быту ........................................ 103
*Пагаворым пра чалавека-працаўніка. Разважайце, расказвайце* ................106

**Хатняя і школьная эканоміка** ............. 107
Што такое эканоміка ............................ 107
Эканоміка сям'і .................................... 110
Школьная эканоміка ............................ 113

**Правы дзіцяці** .................................... 115
Што такое правы чалавека .................... 115
*Пагаворым пра эканоміку і правы дзіцяці. Разважайце, расказвайце* ................118



Правообладатель Национальный институт образования

# ЖЫВАЯ ПРЫРОДА І ЧАЛАВЕК (працяг)

## ЖЫВЁЛЫ — ЧАСТКА ЖЫВОЙ ПРЫРОДЫ

### Разнастайнасць жывёл

Разгледзьце малюнак-схему на форзацы 1. Пакажыце на малюнку звера, птушку, насякомае, рыбу. Назавіце вядомых вам звяроў (птушак, насякомых, рыб). Пакажыце на малюнку жабу (яшчарку). Ці даводзілася вам бачыць іх у прыродзе? Назавіце агульным словам усіх, хто намаляваны.

Органы пачуццяў, нюх, раслінаедныя, драпежныя, усёедныя.

Вавёрка, матылёк, шчупак, жаба, яшчарка, верабей — гэта жывёлы. Яны адрозніваюцца адно ад аднаго знешнім выглядам, памерамі. Напрыклад, скура жывёл пакрыта неаднолькава.



Правообладатель Национальный институт образования

У кагосьці ёсць шэрсць, у кагосьці — пер’е або луска, а ў кагосьці скура голая. Жывёлы насяляюць сушу, глебу, ваду. З улікам падобных прымет іх падзяляюць на групы. Кожная група мае сваю назву. Гэта вядомыя вам насякомыя, рыбы, птушкі і звяры. Пра іншыя групы жывёл вы даведаецеся на наступных уроках.

У адных жывёл ёсць свой прыродны дом: лес, рака, балота або луг. Яны самі здабываюць сабе корм, самі будуюць жыллё. Такіх жывёл называюць дзікімі. Кароў, свіней, курэй разводзяць людзі. Гэта свойская жывёла. Яна не можа жыць без дапамогі чалавека.

Жывёлы перамяшчаюцца. Яны бегаюць, плаваюць, лятаюць, поўзаюць. Ім неабходны корм для харчавання, паветра для дыхання, вада для піцця. Жывёлам патрэбна цяпло, каб не замерзнуць. У дарослых жывёл нараджаюцца дзіцяняты. Самыя старыя жывёлы калі-небудзь паміраюць.

Усё гэта азначае, што жывёлы — частка жывой прыроды. У іх ёсць **органы пачуццяў:** зрок, слых, **нюх** і іншыя. Гэта дапамагае жывёлам знаходзіць ежу, адчуваць небяспеку.

Жывёлы не могуць ствараць для сябе ежу самі. Яны ядуць расліны або іншых жывёл. Ласі, зайцы, каровы, козы кормяцца травой,



Правообладатель Национальный институт образования

галінамі дрэў і кустоў. Такіх жывёл называюць **рас-лін-на-ед-ны-мі**. Назва «раслінаедныя» ўзнікла ад слоў «расліны паядаць». Ваўкі, лісіцы, совы, шчупакі палююць на іншых жывёл. Яны — **драпежныя**. Бурыя мядзведзі, дзікі, вароны ядуць расліны і іншых жывёл. Іх называюць **у-сё-ед-ны-мі**. Назва «ўсёедныя» пайшла ад слоў «усё паядаць».

1. Якой групе жывёл адпавядаюць прыметы?

Не могуць абыходзіцца без дапамогі людзей.
Самі здабываюць сабе ежу.

2. Свойская або дзікая? Падбярыце жывёле пару.

Заяц, ... . Сабака, ... .

3. На якія дзве групы можна падзяліць гэтых жывёл?

Лісіца, кошка, воўк, карова, вавёрка, свіння.

1. Назавіце вядомых вам жывёл. Дзе іх можна ўбачыць?
2. Чаму жывёл адносяць да жывой прыроды?
3*. Чым жывёлы адрозніваюцца адна ад адной?
4*. Прачытайце схему. Прывядзіце прыклады жывёл з кожнай групы.



Правообладатель Национальный институт образования

Жывёлы

расліннаедныя | драпежныя | усёедныя

Наведайце школьны куток прыроды (па магчымасці). Падаглядайце жывёл. Падрыхтуйце паведамленне пра адну з іх.

## Насякомыя

Каго вы бачыце на малюнках? Назавіце ўсіх агульным словам. Што вы ведаеце пра насякомых? Якіх насякомых вы бачылі ў прыродзе?

Галава, грудзі, брушка, насечкі.

Матылёк, жук, пчала, мурашка, муха — насякомыя. Іх можна сустрэць у лесе, полі, агародзе, садзе, на лузе. Яны жывуць на зямлі, у глебе, вадзе, паветры. Адны з іх яркія, другія — непрыметныя. Усе насякомыя маюць падобныя прыметы. Іх цела складаецца з **галавы,**


*Матылёк*


*Жук*


*Пчала*


*Мурашка*


*Муха*



Правообладатель Национальный институт образования

**грудзей, брушка**. У кожнага насякомага 6 ног. У многіх ёсць крылы. На брушку відаць тонкія рыскі — **насечкі**. Адсюль і назва — «насякомыя».

Насякомыя перамяшчаюцца па-рознаму. Яны скачуць, поўзаюць, лятаюць, плаваюць, бегаюць.

Насякомыя кормяцца рознай ежай. Прачытайце і вызначце, хто з іх расліннаедны (драпежны, усёедны).

Матылькі, пчолы здабываюць з кветак салодкі нектар. Тля смокча сок раслін. Божыя кароўкі паядаюць тлю. Стракозы ловяць мух, камароў. Мурашкі харчуюцца сакавітымі часткамі раслін, дробнымі жукамі, вусенямі.

Насякомыя адыгрываюць вялікую ролю ў прыродзе. Шмат якія з іх апыляюць кветкі. Без апылення не бывае пладоў. Мурашкі знішча-юць лясных шкоднікаў. Божыя кароўкі дапамагаюць захаваць ураджай на палях, у агародах, садах. Большасць насякомых упрыгожваюць прыроду. Імі кормяцца жабы, шматлікія рыбы, птушкі.

1. Разгледзьце малюнкі на старонцы 8. Выберыце выявы насякомых. Якое падабенства ёсць ва ўсіх насякомых? З апорай на малюнак назавіце часткі цела насякомага. Пакажыце галаву (грудзі, брушка, крылы, ногі).



Правообладатель Национальный институт образования

2. Прадоўжыце пералік.

Насякомыя — гэта жукі, ... .

1. Дзе ў прыродзе можна сустрэць насякомых?
2. Назавіце вядомых вам насякомых.
3*. Чым насякомыя адрозніваюцца ад іншых жывёл?
4*. Што ядуць насякомыя? Прачытайце ў тэксце. Перакажыце.

Падчас прагулак паназірайце за насякомымі ў прыродзе. Як яны выглядаюць? Як перамяшчаюцца? Падрыхтуйце паведамленне «Цікавыя факты пра насякомых».

## Рыбы

Каго вы бачыце на малюнках? Назавіце агульным словам усіх, хто намаляваны. Што вы ведаеце пра рыб?

Плаўнік, луска, жабры, ікра.

Карась, таўсталобік, акунь, шчупак — гэта рыбы. Яны ўвесь час жывуць у вадзе. Без вады рыбы хутка гінуць. Ва ўсіх рыб ёсць падабенства. Іх целы складаюцца з галавы, тулава і хваста. На целе ёсць **плаўнікі**. Яны дапамагаюць рыбе плаваць. Скура рыб пакрыта **луской**. На галаве ў іх размяшчаюцца вочы, рот.



Правообладатель Национальный институт образования



*Карась*



*Таўсталобік*



*Шчупак*



*Акунь*

Па баках рота знаходзяцца **жабры.** Рот у рыбы ўвесь час адкрываецца і закрываецца. Яна набірае ў яго ваду і прапускае праз жабры. Так рыба дыхае. Рыбы адкладваюць у ваду **ікру**. З ікрынак развіваюцца малькі.

У рэках і азёрах Беларусі водзяцца раслінаедныя, драпежныя, усёедныя рыбы. Таўсталобік — раслінаедны. Ён корміцца водарасцямі. Гэту рыбу спецыяльна запускаюць у вадаёмы, каб ачысціць іх ад водарасцей. Шчупак, акунь харчуюцца дробнымі рыбкамі, смаўжамі, жабянятамі. Гэта драпежныя рыбы. Карась паядае часткі водных раслін, чарвякоў, насякомых. Ён усёедны.

1. Разгледзьце прапанаваныя настаўнікам малюнкі. Выберыце выявы рыб. Якое падабенства ёсць у іх? З апорай на малюнак назавіце часткі цела рыбы. Пакажыце галаву (тулава, хвост, плаўнікі, жабры).



Правообладатель Национальный институт образования

2. Падбярыце роднасныя словы.

Рыба — рыбка, ..., ... .

Мяса рыб смачнае і карыснае. Таму людзі ловяць іх у вадаёмах або купляюць у магазінах. Рыбы з'яўляюцца ежай для іншых водных і каляводных жывёл. Іх жыццё ў рэках і азёрах залежыць ад чысціні вады. Таму вадаёмы трэба берагчы ад забруджвання.

1. Прывядзіце прыклады рыб. Для адказу выкарыстоўвайце малюнкі на старонцы 11.

2. З якіх частак складаецца цела рыбы?

3*. Чым рыбы адрозніваюцца ад іншых жывёл?

4*. На якія групы падзяляюць рыб па спосабе харчавання? Прывядзіце прыклады з кожнай групы.

Паназірайце за рыбкамі ў акварыуме (па магчымасці). Як яны выглядаюць? Як перамяшчаюцца? Як кормяцца? Дапамагайце дарослым даглядаць рыбак. Падрыхтуйце паведамленне пра адну з іх.

## Жабы і рапухі

Дзеці ішлі па беразе сажалкі. У траве скакалі жабы. Пачуўшы крокі дзяцей, яны ныралі ў ваду. Дзе жывуць жабы: на сушы або ў вадзе?

Ноздры, перапонка, апалонік, земнаводныя.



Правообладатель Национальный институт образования



*Жаба*



*Апалонік*



*Рапуха*

***Жабы*** жывуць па берагах рэк, азёр, сажалак. Іх цела складаецца з галавы, тулава і чатырох ног. У жабы няма шыі. Таму яна не можа паварочваць галаву ў бакі. На галаве размешчаны вочы, **ноздры**, шырокі рот. Скура голая, гладкая, слізкая. Заднія ногі ў жабы даўжэйшыя і мацнейшыя за пярэднія. Паміж пальцамі задніх ног ёсць **перапонкі**. Яны дапамагаюць жабе плаваць.

Афарбоўка цела жаб зліваецца з колерам зялёных раслін. Гэта робіць іх непрыметнымі сярод травы.

Жабы ядуць насякомых і іх лічынак. Яны шукаюць корм у вадзе, на сушы, хапаюць яго з раслін, ловяць на ляту. Жабы хутка скачуць, калі бачаць насякомае. Пры гэтым выкідваюць з рота доўгі ліпкі язык. Утрымліваць здабычу ім дапамагаюць зубы. Жаб паядаюць драпежныя рыбы, птушкі.

***Рапуха*** адрозніваецца ад жабы. Яна тоўстая, непаваротлівая. Скура ў рапухі гу-за-ва-та-я. Заднія ногі яе карацей, чым у жабы. Рапуха



Правообладатель Национальный институт образования

перамяшчаецца, павольна пераступаючы нагамі. Скакаць яна не любіць. Рапухі жывуць у сырых месцах. Насяляюць сады, агароды. Харчуюцца слізнякамі, вусенямі, мухамі. Знішчаючы вялікую колькасць шкоднікаў, яны дапамагаюць зберагчы ўраджай.

Некаторыя людзі не любяць жаб і рапух. Кажуць, што яны непрыгожыя. Жабы, рапухі — без-а-ба-рон-ны-я карысныя жывёлы. Яны маюць патрэбу ў ахове. Абараняйце іх! Сяброў жа выбіраюць не па прыгажосці.

Вясной жабы і рапухі адкладваюць у ваду ікру. З ікры з'яўляюцца **апалонікі**. Яны хутка растуць, развіваюцца. Праз некаторы час апалонікі ператвараюцца ў маленькіх жабак і рапух. Яны выпаўзаюць з вады на сушу і могуць жыць тут. Жабы, рапухі адносяцца да **земнаводных**. Частку жыцця яны праводзяць на сушы (гэта значыць на зямлі), а частку — у вадзе. За гэта яны і атрымалі сваю назву.

1. Разгледзьце малюнкі на старонцы 13. Якое падабенства ёсць у жабы і рапухі? У чым іх адрозненне? З апорай на малюнак назавіце часткі цела жабы (рапухі). Пакажыце галаву, тулава, ногі. Як вы ставіцеся да жаб і рапух? Чаму так?



Правообладатель Национальный институт образования

2. Як перамяшчаюцца жаба і рапуха? Выкарыстоўваючы пытанні і апорныя словы, складзіце сказы.

**Хто?** Жаба, рапуха.
**Што робіць?** Скача, пераступае, плавае, нырае.
**Як?** Хутка, павольна.

1. З якіх частак складаецца цела жабы?
2. Дзе можна сустрэць жаб? Рапух?
3*. Як земнаводныя перамяшчаюцца па зямлі? У вадзе?
4*. Растлумачце, чаму жаб і рапух адносяць да земнаводных.

Вясной паназірайце за апалонікамі (па магчымасці). Як яны выглядаюць? Як перамяшчаюцца? Даведайцеся, у чым асаблівасць языка жабы.

## Яшчаркі, змеі, чарапахі

Хлопчык схапіў яшчарку. Ён хацеў яе разгледзець. Яшчарка вырвалася і схавалася ў траве. У руках у хлопчыка застаўся яе хвост. Хлопчык разгубіўся. Ён не хацеў адрываць хвост яшчарцы. Што здарылася?

Панцыр, паўзуны.

***Яшчарка.*** У целе яшчаркі вылучаюць галаву, шыю, тулава, хвост і чатыры нагі. Тулава ў яе прадаўгаватае, хвост доўгі. Дзякуючы шыі галава



Правообладатель Национальный институт образования


Чарапаха


Гадзюка


Вуж


Яшчарка

яшчаркі паварочваецца ў бакі. Афарбоўка цела робіць яе непрыметнай сярод травы. Яшчарка хутка бегае. Калі схапіць яе за хвост, то яна адкідае яго. Гэта ж лепш, чым загінуць самой. Праз некаторы час хвост адрастае нанава. Яшчарка харчуецца насякомымі, іх лічынкамі, чарвякамі.

***Змеі***. Вуж, гадзюка — змеі. Іх цела выцягнутае. Галава, тулава і хвост пераходзяць адно ў адно без рэзкіх меж. Ног у змей няма. Яны поўзаюць, выгінаючы сваё цела. Змеі ўмеюць плаваць. Яны палююць на мышэй, птушак, яшчарак, рыб, жаб. Здабычу заглытваюць цалкам, нярэдка жыўцом. Змеі — драпежнікі.

***Вуж*** — неядавітая змяя. У яго звычайна цёмная спіна. Па баках галавы ёсць дзве аран-



Правообладатель Национальный институт образования

жава-жоўтыя плямы. Па гэтай прымеце вужа лёгка адрозніць ад іншых змей.

***Гадзюка*** — небяспечная ядавітая змяя. Гадзюкі бываюць шэрага, карычневага, чорнага колераў. Уздоўж спіны ў іх ёсць хвалісты ўзор. Па гэтым узоры і адрозніваюць гадзюку ад іншых змей. Яд гадзюкі можа быць смяротным для чалавека. Пры ўкусе трэба неадкладна звярнуцца да ўрача.

***Чарапахі***. Галоўная асаблівасць чарапах — моцны **панцыр** на тулаве. Галава, шыя і ногі панцырам не пакрыты. Яны высоўваюцца з яго адтулін і ўцягваюцца назад. Так чарапахі абараняюцца ад нападу.

У нашай краіне на балотах, у сажалках, азёрах жыве балотная чарапаха. Па сушы яна перамяшчаецца марудна, затое добра плавае і нырае. Чарапаха харчуецца толькі ў вадзе. Ловіць смаўжоў, чарвякоў, насякомых. Таксама яна есць мяккія часткі водных раслін. Балотная чарапаха — усёедная жывёла. Яна занесена ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь.

Яшчаркі, змеі, чарапахі — наземныя жывёлы. Падчас руху іх цела змыкаецца, датыкаецца да паверхні зямлі. Гэту групу жывёл назвалі **паў-зу-на-мі**. Убачыць паўзуноў у прыродзе можна не заўсёды. Назіраць за імі добра ў заапарку.



Правообладатель Национальный институт образования

1. Правядзіце гульню «Так або не». Выберыце вядучага. У яго ў руках закрытая карцінка. Каб даведацца, хто на ёй намаляваны, задавайце пытанні. Распытваць трэба так, каб вядучы мог адказваць толькі словамі «так» або «не». Адказы запісвайце на дошцы. Пытанні задавайце да той пары, пакуль карцінка не будзе названа. Пачаць можна так: *«Гэта жывёла? Яна свойская? Гэта птушка?»* і г. д.

З апорай на адкрытую карцінку і запісаныя адказы складзіце паведамленне пра жывёлу.

2. Чым вуж і гадзюка падобны адно на аднаго? Чым адрозніваюцца? Як у прыродзе распазнаць вужа? Гадзюку?

1. З апорай на малюнкі на старонцы 16 раскажыце пра будову цела яшчаркі (змяі).

2. Чым харчуецца яшчарка (вуж, гадзюка)?

3*. Прачытайце схему. Раскажыце пра змей. Якіх змей трэба асцерагацца? Чаму?




4*. Да якой групы жывёл адносяцца яшчаркі, змеі, чарапахі? Чаму гэту групу жывёл так называюць?

Пазнаёмцеся з Чырвонай кнігай Рэспублікі Беларусь (частка 2). Разгледзьце малюнкі, прачытайце



Правообладатель Национальный институт образования

назвы жывёл, якіх трэба ахоўваць. Падрыхтуйце паведамленне «Жывёлы з Чырвонай кнігі Рэспублікі Беларусь».

## Птушкі

Каго вы бачыце на малюнках? Назавіце агульным словам усіх, хто намаляваны. Што вы ведаеце пра птушак? Якіх птушак вы бачылі ў прыродзе?

Пер’е, дзюба, гняздо, кіпцюры.

Ластаўка, шпак, бусел, верабей, сініца — гэта птушкі. Іх скура пакрыта **пер’ем**. Пер’е захоўвае цяпло, засцерагае ад холаду. У птушак ёсць галава, шыя, тулава і дзве пары канечнасцей (2 нагі і 2 крылы). На галаве ў іх размешчаны вочы. У птушак няма зубоў,



*Ластаўка*



*Шпак*



*Бусел*



*Верабей*



*Сініца*



Правообладатель Национальный институт образования

затое ёсць **дзюба**. Яны дзяўбуць ёю корм, ствалы дрэў, скубуць траву. З дапамогай дзюбы птушкі будуюць **гняздо**, кормяць птушанят, абараняюцца. Яе форма і даўжыня залежаць ад спосабу харчавання. Напрыклад, драпежныя птушкі маюць моцную дзюбу з загнутым вострым канцом.

Птушыныя ногі прыстасаваны не толькі для хадзьбы. На іх ёсць пальцы з вострымі **кіпцюрамі**. Імі птушкі разгортваюць зямлю, хапаюць здабычу, утрымліваюцца на галінах дрэў. З дапамогай ног качкі, гусі плаваюць па вадзе. Гэта водаплаўныя птушкі.

Шмат якія птушкі ўмеюць лятаць. У гэтым ім дапамагаюць крылы.

Птушынае пер’е лёгкае, трывалае, мяккае, цёплае. Людзі кажуць, што пасцель у птушкі заўсёды з сабой. Пер’е на брушку — пярынка. Пер’е на спінцы — коўдра. З такой пасцеллю можна спаць усюды, нават на вадзе. Так робяць гусі, качкі, лебедзі.

Птушкі галасам падаюць адна адной розныя сігналы. Вароны каркаюць. Журавы курлыкаюць. Галубы буркуюць. Сініцы свішчуць. Вераб’і цвыркаюць. Нехта шчабеча, нехта гагоча.

Птушкі робяць гнёзды. Яны іх лепяць, плятуць, складваюць, падвешваюць. У іх адкладваюць яйцы, выседжваюць птушанят.



Правообладатель Национальный институт образования

***Памятайце!*** Нельга трывожыць птушку, якая сядзіць у гняздзе. Калі птушка пакіне яго, то яйцы астынуць. Птушаняты з іх не выведуцца.

Птушкі ядуць розную ежу. Прачытайце і вызначце, хто з іх раслінна|едны (драпежны, усёедны).

Асноўным кормам голуба, снегіра з'яўляюцца плады і насенне раслін. Сава, ястраб ловяць мышэй, зайчанят, яшчарак, дробных птушак. Варона, грак ядуць зялёныя часткі раслін, ягады, насякомых, чарвякоў.

Ластаўкі, шпакі, буслы зімой не знаходзяць сабе корму. Таму яны адлятаюць у цёплыя краі. Гэта пералётныя птушкі. Вераб'і, вароны, сініцы застаюцца зімаваць. Іх называюць зімуючымі. Але і гэтыя птушкі могуць загінуць зімой ад голаду. Таму людзі падкормліваюць іх.

Птушкі знішчаюць вялікую колькасць насякомых-шкоднікаў. Яны разносяць плады і насенне раслін. Птушкі ўпрыгожваюць прыроду, радуюць нас сваімі спевамі.

1. Замяніце словазлучэнні іншымі словамі, якія падыходзяць па сэнсе. Пастаўце да іх пытанні: ч ы й? ч ы ё? ч ы я? ч ы е?



Правообладатель Национальный институт образования

**Хвост птушкі — … . Гняздо вароны — … . Галава ластаўкі — … . Пер’е птушкі — … . Яйцо голуба — … .**

2. Замест кропак падбярыце словы, якія падыходзяць па сэнсе. Раскажыце, хто кім быў і кім стаў.

**Шпачаня — … . Савяня — … . Зязюляня — … . Верабейка — … .**

3. Дапоўніце сказы. Якія птушкі так падаю́ць голас? У якіх выпадках так гавораць пра людзей?

**Стракоча, як … . Шчабеча, як … . Гагочуць, як … . Буркуюць, як … .**

? 1. Назавіце вядомых вам птушак. Для адказу выкарыстоўвайце малюнкі на старонцы 19.

2. Растлумачце, чым птушкі адрозніваюцца ад іншых жывёл.

3*. З апорай на малюнак апішыце знешні выгляд і будову цела адной птушкі (на выбар).

4*. Прачытайце схемы. На якія групы можна падзяліць птушак? З апорай на тэкст прывядзіце прыклады птушак з кожнай групы.






Правообладатель Национальный институт образования

Птушкі

перaлётныя | зімуючыя

Разам з дарослымі зрабіце кармушкі для птушак. Паразвешвайце іх каля школы або дома. Арганізуйце птушыную «сталовую». Паназірайце за птушкамі. Як яны выглядаюць? Як перамяшчаюцца? Як кормяцца?

## Звяры

Каго вы бачыце на малюнках? Назавіце ўсіх агульным словам. Што вы ведаеце пра звяроў? Якія іншыя звяры вам вядомы?

Шэрсць, млекакормячыя.



*Вавёрка*



*Мыш*



*Кіт*



*Слон*



*Тыгр*



Правообладатель Национальный институт образования

Вавёрка, мыш, кіт, слон, тыгр — гэта звяры. Яны адрозніваюцца сваім знешнім выглядам. Але ва ўсіх звяроў ёсць падабенства. Іх скура амаль заўсёды пакрыта **шэрсцю** (валаскамі). Звяры нараджаюць дзіцянят. У першыя месяцы жыцця яны кормяць іх малаком. Ад слоў «малаком карміць» пайшла іншая назва групы — **млекакормячыя**. Калі дзіцяняты звяроў падрастаюць, яны могуць есці розную ежу.

Звяры жывуць на паверхні зямлі, у глебе (крот), у вадзе (кіт). Іх целы маюць розныя форму, памер, афарбоўку, але аднолькавыя часткі. Напрыклад, цела наземных звяроў складаецца з галавы, шыі, тулава, чатырох канечнасцей (ног), хваста. На галаве ў іх размешчаны рот, нос, вочы, вушы. У звяроў добра развіты зрок, слых, нюх.

Звяры бываюць свойскімі і дзікімі. Свойскія звяры — гэта карова, конь, свіння, сабака і іншыя. Яны жывуць побач з чалавекам: у хляве, доме, на ферме. Дзікія звяры насяляюць лясы, лугі, берагі рэк, азёр і ваду. Свае гнёзды і норы яны робяць непрыметнымі. Дзікія звяры не падпускаюць да сябе людзей. Яны ўцякаюць, хаваюцца, адплываюць.

Звяры кормяцца рознай ежай. У залежнасці ад таго, што яны ядуць, вылучаюць групы: раслінnаедныя, драпежныя, усёедныя. Лось,



Правообладатель Национальный институт образования

заяц харчуюцца сакавітым лісцем, сцёбламі траў, галінкамі з лісцем дрэў і кустоў. Гэта расліннаедныя звяры. Воўк, лісіца — драпежнікі. Яны палююць на зайцоў, мышэй, птушак. Буры мядзведзь есць лісце, сцёблы і карані раслін, лясныя ягады, яблыкі. У ежу ён таксама ўжывае розных насякомых, чарвякоў, ловіць у вадзе рыб, жаб. Дзікі харчуюцца жалудамі, каранямі і лісцем раслін, грыбамі. Яны ядуць буйны́х насякомых, мышэй, чарвякоў, жаб. Буры мядзведзь, кабан — усёедныя звяры.

Выжываць звярам дапамагаюць іх асаблівасці. Напрыклад, пушысты хвост вавёркі служыць рулём пры скачках. Зімой ён замяняе звярку цёплую коўдру. Вострыя кіпцюры дапамагаюць спрытна лазіць па дрэвах. Моцнымі зубамі вавёрка лёгка разгрызае арэхі, жалуды, шышкі.

1. Замяніце словазлучэнні іншымі словамі, якія падыходзяць па сэнсе. Пастаўце да іх пытанні: ч ы й? ч ы ё? ч ы я? ч ы е?

Выццё воўка — … . Нара лісіцы — … . Галава зайца — … . Бярлога мядзведзя — … . Зубы вавёркі — … . Капыты лася — … .

2. Замест кропак падбярыце назвы дзіцянят кожнай жывёлы. Раскажыце, хто кім быў.



Правообладатель Национальный институт образования

Заяц — ... . Лось — ... . Воўк — ... . Мядзведзь — ... . Вавёрка — ... .

3. Пра якіх звяроў так гавораць? У якіх казках вы з імі сустракаліся? Калі так гавораць пра людзей?

Хітры, як ... . Баязлівы, як ... . Калючы, як ... .

4. Растлумачце, чаму так кажуць: *«Воўка ногі кормяць»*.

1. Назавіце вядомых вам звяроў. Выкарыстоўвайце малюнкі на старонцы 23.

2. Растлумачце, чым звяры адрозніваюцца ад іншых жывёл.

3*. З апорай на малюнак раскажыце пра знешні выгляд і будову цела аднаго са звяроў (на выбар).

4*. На якія групы падзяляюць звяроў па спосабе харчавання? Прывядзіце прыклады.

Наведайце заапарк або звярынец (па магчымасці). Даведайцеся, якіх жывёл там утрымліваюць. Для чаго?

***Памятайце!*** У час наведвання заапарка або звярынца нельга працягваць рукі да клетак. Увогуле нічога нельга рабіць без дазволу дарослых і работнікаў заапарка (звярынца)!



Правообладатель Национальный институт образования

## Раслiннаедныя звяры

Каго вы бачыце на малюнках? Што вы ведаеце пра гэтых звяроў? Разгледзьце выяву аднаго са звяроў. Назавiце часткi яго цела.

Шорах, рогi, статак, хатка.

Заяц, лось, бабёр — раслiннаедныя звяры. Пазнаёмцеся з iмi (можна на выбар).

***Заяц*** — невялiкi дзiкi звярок. Шэрсць у яго мяккая, пушыстая. Зiмой — цёплая, светлая. Такое футра ратуе ад маразоў i хавае ад драпежнiкаў. Вясной заяц становiцца шэрым. I зноў яго не вiдаць у лесе i полi. Заднiя ногi зайца даўжэйшыя i мацнейшыя за пярэднiя. Iмi звярок адштурхваецца пры скачках, хуткiм бегу. Доўгiя вушы дапамагаюць яму ўлоўлiваць любыя **шорахi**. Зайцы ядуць траву, галiнкi, лiсце дрэў i кустоў, кару. Кожны год у зайчыхi нараджаюцца зайчаняты. Мацi кормiць iх сваiм малаком. Зайчаняты хутка растуць i пачынаюць харчавацца травой.



*Заяц*



*Лось*



*Бабёр*



Правообладатель Национальный институт образования

***Лось*** — вялікі і дужы звер. Яго называюць лясным волатам. На галаве ў ласяя ёсць шырокія **рогі**. Ласіхі бязрогія. На нагах у гэтага звера — капыты з вострымі краямі. Ударам нагі ён можа забіць воўка. Летам ласі харчуюцца сакавітай зялёнай травой. Зімой ядуць галінкі з лісцем, кару дрэў і кустоў.

Ласі трымаюцца невялікімі **статкамі**. Разам ім лягчэй а-ба-ра-няц-ца ад драпежнікаў. У ласіхі звычайна нараджаецца адно або двое ласянят. Ласяняты падобны на цялят і ўсюды ходзяць за маці. Малышоў ласіха корміць сваім малаком. Калі дзіцяняты падрастаюць, яна вучыць іх здабываць корм. Бывае, людзі ўстанаўліваюць у лесе спецыяльныя кармушкі. У іх пакідаюць корм для дзікіх звяроў.

***Бабёр*** жыве каля лясных рэк і азёр. У беразе вадаёма ён выкопвае сабе нару з выхадам пад ваду. Побач будуе **хатку** з тоўстых галін і зямлі. Бабёр добра плавае і нырае. Ён харчуецца воднымі раслінамі, грызе кару і стваλы ліставых дрэў. Восенню нарыхтоўвае галінкі на зіму. Вясной у баброў з'яўляюцца бабраняты. Маці корміць іх сваім малаком. Прыкладна праз месяц бабраняты пачынаюць есці траву.

1. Разгледзьце прапанаваныя настаўнікам малюнкі. Выберыце выявы раслінаедных звяроў. Як у прыродзе распазнаць зайца? Ласяя? Бабра?



Правообладатель Национальный институт образования

2. З апорай на план складзіце апавяданне пра аднаго са звяроў (на выбар).

- Назва жывёлы.
- Асноўныя часткі цела.
- Асаблівасці знешняга выгляду (памеры частак цела, іх форма, афарбоўка).
- Як перамяшчаецца?
- Дзе жыве?
- Чым харчуецца?
- Хто дзіцяняты?
- Да якой групы жывёл належыць?
- Якую дапамогу чакае ад людзей?

1. З апорай на малюнкі на старонцы 27 назавіце вядомых вам раслінаедных звяроў.

2. Чаму зайца, лася, бабра не адносяць да драпежных звяроў?

3*. Чым харчаванне дарослых звяроў адрозніваецца ад харчавання іх дзіцянят?

4*. У чым падабенства лася і зайца? У чым адрозненне?

Падбярыце і прачытайце невялікае апавяданне пра раслінаеднага звера.

## Драпежныя звяры

Каго вы бачыце на малюнках на старонцы 30? Назавіце ўсіх агульным словам. Па якой прымеце гэтых звяроў аб'ядноўваюць у адну групу?



Правообладатель Национальный институт образования



*Воўк*



*Лісіца*



*Рысь*

Кутасікі, логава.

Воўк, лісіца, рысь ядуць мяса іншых жывёл. Ва ўсіх драпежнікаў на лапах ёсць вострыя кіпцюры. У роце — моцныя зубы. Кіпцюры і зубы дапамагаюць захопліваць і ўтрымліваць здабычу. У драпежнікаў добра развіты зрок, слых, нюх. У розных месцах зямнога шара жывуць ільвы, тыгры, белыя мядзведзі. Гэта рэдкія звяры, таму іх ахоўваюць. Пазнаёмцеся з драпежнымі звярамі (можна на выбар).

***Лісіцу*** мы пазнаём па рыжай афарбоўцы шэрсці і доўгім пушыстым хвасце. У яе стаячыя вушы, моцныя ногі. Лісіца жыве ў нары. Яна палюе на птушак, зайцоў, мышэй. Здабычу хапае вострымі зубамі. Знішчаючы мышэй, лісіца прыносіць карысць. Вясной у яе нара-



Правообладатель Национальный институт образования

джаюцца лісяняты. Спачатку яны харчуюцца малаком маці. Затым бацькі прыносяць лісянятам параненых птушак і зверкоў. Так яны прывучаюць дзіцянят паляваць.

***Памятайце!*** Лісіная сям'я пакідае нару, калі яе знайшоў чалавек. Таму не раскопвайце жыллё дзікіх жывёл, не турбуйце іх. Не лавіце і не забірайце дадому дзіцянят. Дзікія звяры не могуць жыць у няволі. Ваш дом не заменіць ім родную прыроду.

***Рысь*** — вялікая лясная кошка. Яна жыве ў густых лясах. У рысі кароткае тулава, невялікая галава. Хвост кароткі. Ногі высокія, дужыя. На лапах — моцныя, вострыя кіпцюры. На галаве ў рысі стаячыя вушы з **кутасікамі** на канцах. Днём гэты звер спіць у сваім **логаве**. Ім можа быць схаваная ў лясных зарасніках яма. На паляванне рысь выходзіць уначы. Яна выдатна лазіць па дрэвах, добра плавае. Рысь нападае на мышэй, лясных птушак, зайцоў. Ад яе не ўцячэ лісяня і нават ласяня. У лясах нашай краіны рысь сустракаецца рэдка. Яна ўключана ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь.

1. Разгледзьце прапанаваныя настаўнікам малюнкі. Выберыце выявы драпежных звяроў. Што яны



Правообладатель Национальный институт образования

ядуць? Як у прыродзе распазнаць воўка? Лісіцу? Рысь? З апорай на малюнак назавіце часткі цела аднаго са звяроў (на выбар).

2. Складзіце апавяданне пра аднаго драпежнага звера. Выкарыстоўвайце план на старонцы 29.

1. З апорай на малюнкі на старонцы 30 назавіце вядомых вам драпежных звяроў.

2. Чаму лісіцу, рысь не адносяць да раслінаедных звяроў?

3*. Чым харчаванне рысі адрозніваецца ад харчавання лася?

4*. У чым падабенства лісіцы і рысі? У чым адрозненне?

Падбярыце і прачытайце невялікае апавяданне пра драпежнага звера. Даведайцеся, які драпежны звер самы буйны. Які самы маленькі?

## Усёедныя звяры

Каго вы бачыце на малюнках? Што вам вядома пра гэтых звяроў?

Бярлога, смоўж.

Буры мядзведзь, дзік — усёедныя звяры. Яны кормяцца раслінналй і жывёльнай ежай, грыбамі. Пазнаёмцеся з усёеднымі звярамі (можна на выбар).



Правообладатель Национальный институт образования



*Буры мядзведзь*



*Дзік*

***Буры мядзведзь*** жыве ў густых лясах. У яго вялікая галава, кароткая шыя, буйное тулава. На тоўстых нагах доўгія кіпцюры. На галаве ў мядзведзя — кароткія круглыя вушы. Морда ў яго выцягнутая. У роце — вялікія вострыя зубы. Мядзведзь хутка бегае, можа плаваць, залазіць на дрэвы. Ён харчуецца мясам буйных і дробных жывёл. Мядзведзь ловіць у вадзе рыб, жаб. Есць розных насякомых, чарвякоў. Ён любіць сакавітае лісце, сцёблы і карані раслін, лясныя ягады, яблыкі. Зіму мядзведзь праводзіць у **бярлозе**. У гэту пару года ў мядзведзіцы нараджаюцца медз-ве-дзя-ня-ты. Яны маленькія, велічынёй з рукавіцу дарослага чалавека. Маці корміць іх малаком, саграваае цяплом свайго цела. Буры мядзведзь занесены ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь.

***Дзікі (кабаны)*** жывуць невялікімі статкамі. Днём яны спяць у неглыбокіх ямах з лісцем. Па вечарах блукаюць па лясах у пошуках корму. Дзікі ядуць жалуды, сакавітыя карані раслін,



Правообладатель Национальный институт образования

грыбы. Прыходзяць на палі, дзе кормяцца бульбай, зернем. Так дзікі вытоптваюць поле і знішчаюць ураджай. Яны таксама ядуць чарвякоў, **смаўжоў**, мышэй, яшчарак, птушак. У дзікіх свіней нараджаюцца парасяты. Спачатку яны кормяцца малаком маці. Потым самі шукаюць сабе корм.

1. Разгледзьце прапанаваныя настаўнікам малюнкі. Выберыце выявы ўсёедных звяроў. Што яны ядуць? Як у прыродзе распазнаць бурага мядзведзя? Дзіка? Назавіце і пакажыце з апорай на малюнак часткі цела аднаго са звяроў.

2. Складзіце апавяданне пра аднаго з усёедных звяроў (на выбар). Выкарыстоўвайце план на старонцы 29.

3. Падзяліцеся на пары. Няхай адзін з вас называе звера, а другі — групу, да якой гэты звер належыць. Напрыклад: *«Воўк. Гэта драпежны звер»*.

1. З апорай на малюнкі на старонцы 33 назавіце вядомых вам усёедных звяроў.

2. Чаму бурага мядзведзя, дзіка не адносяць да драпежнікаў?

3*. Чым харчаванне бурага мядзведзя адрозніваецца ад харчавання лісіцы?

4*. У чым падабенства бурага мядзведзя і дзіка? У чым іх адрозненне?

Падбярыце і прачытайце невялікае апавяданне пра ўсёеднага звера.



Правообладатель Национальный институт образования

## У прыродзе ўсе важныя, усе патрэбныя

Назавіце расліны і жывёл з Чырвонай кнігі Рэспублікі Беларусь, з якімі вы пазнаёміліся ўжо.

Асушваць, Белавежская пушча.

У Беларусі шмат лясоў, лугоў, рэк, азёр і балот. Усё гэта — прыродны дом для дзікарослых раслін і дзікіх жывёл. Аднак людзі высякаюць лясы, **асушваюць** балоты, узворваюць лугі. Замест іх будуюць гарады, пасёлкі, пракладваюць дарогі, засяваюць палі. Калі высечы лес, то перасохнуць рэкі. Не будзе лесу, ракі, балота, лугу — загінуць расліны. Без раслін знікнуць жывёлы. Жывёлы гінуць яшчэ тады, калі людзі руйнуюць месцы іх пасялення, палююць на іх.

У нашай краіне сталі рэдкімі жук-алень, рыба сцерлядзь, чаротавая жаба, шэры жураўель. Гэтыя жывёлы занесены ў Чырвоную



*Зубр*



*Жук-алень*



*Барсук*



*Шэры жураўель*



Правообладатель Национальный институт образования

кнігу Рэспублікі Беларусь. Але ці толькі яны чакаюць дапамогі ад людзей? Многія іншыя жывёлы маюць патрэбу ў ахове. Берагчы трэба ўсіх! Інакш яны таксама стануць рэдкімі і трапяць у Чырвоную кнігу.

Больш падрабязна пазнаёмцеся з ахоўнымі звярамі (можна на выбар).

***Зубр*** — самы буйны звер у Беларусі. Ён харчуецца травой, лісцем, галінамі дрэў і кустоў. Зубр аб'ядае кару асіны, рабіны, есць грыбы. Гэта раслінаедная жывёла. Самка зубра звычайна нараджае адно дзіцяня. Зубраня хутка ўстае на ногі і бегае за маці. Самка зубра корміць яго сваім малаком. Паступова зубраня вучыцца скубці траву. У нашай краіне шмат зуброў жыве ў **Белавежскай пушчы.**

***Барсук*** — невялікі звер з вострай мордачкай. Яго скура пакрыта густой доўгай шэрсцю. У барсука кароткія ногі. На лапах ёсць вострыя кіпцюры. Барсук рые глыбокую нару з некалькімі выхадамі. Днём ён там спіць. Ноччу выходзіць шукаць корм. Паядае ўсё, што трапляецца: траву, плады і карані раслін, грыбы. Барсук таксама есць насякомых, слізнякоў, чарвякоў, жаб, мышэй, птушанят. Гэта ўсёедная жывёла.

1. Разгледзьце прапанаваныя настаўнікам малюнкі. Выберыце выявы жывёл з Чырвонай кнігі. Чаму гэтых жывёл трэба ахоўваць?



Правообладатель Национальный институт образования

2. Складзіце апавяданне пра аднаго з рэдкіх звяроў (на выбар). Выкарыстоўвайце малюнкі на старонцы 35 і план на старонцы 29.

1. Назавіце жывёл, якія ў нашай краіне асабліва ахоўваюцца.

2. Чаму многія дзікія жывёлы становяцца рэдкімі?

3*. Чым харчаванне зубра адрозніваецца ад харчавання рысі?

4*. Для чаго ў нашай краіне створана Чырвоная кніга?

Падбярыце і прачытайце невялікае апавяданне пра жывёлу з Чырвонай кнігі Рэспублікі Беларусь.

## Свойская жывёла

Прывядзіце прыклады свойскай жывёлы. Каго адносяць да звяроў, а каго — да птушак? Ці разводзяць людзі рыб? Насякомых?

Пчальнік, капыт, паша, кароўнік, лыч, свінарнік.


Карова


Свіння


Куры


Каза



Правообладатель Национальный институт образования

Карова, свіння, конь, каза, сабака — свойская жывёла. Яна жыве ў гаспадарцы чалавека. Людзі даглядаюць жывёлу: кормяць, чысцяць, лечаць. Для свойскай жывёлы будуюць хлявы, фермы. Для яе нарыхтоўваюць кармы. Сярод свойскай жывёлы ёсць не толькі звяры. Людзі ўтрымліваюць таксама свойскіх птушак: курэй, качак, гусей. У сажалках вырошчваюць рыб (карпаў). У **пчальніках** разводзяць пчол. Людзі атрымліваюць ад свойскай жывёлы прадукты харчавання, воўну, пух, скуру, мёд. Коні перавозяць грузы і людзей. Сабакі ахоўваюць чалавека і яго дом. Кошкі ловяць мышэй. Больш падрабязна пазнаёмцеся са свойскай жывёлай (можна на выбар).

***Карова*** — буйная жывёла. *(Разгледзьце малюнак на старонцы 37. Назавіце часткі цела каровы.)* Цвёрдыя **капыты** абараняюць яе ногі ад пашкоджанняў. Доўгім хвастом яна адганяе ад сябе мух. У кароў нараджаюцца цяляты. Летам іх пасуць разам на **пашы**. Там яны ядуць свежую траву. Зімой кароў трымаюць у **кароўніках**. Іх кормяць сенам. Пры добрым доглядзе каровы даюць шмат малака і мяса.

***Свіння*** — не вельмі буйная жывёла. *(З апорай на малюнак назавіце часткі цела свінні.)* Выцягнутае рыла заканчваецца **лычом**. Рылам свіння рые зямлю. Так яна шукае і паядае сакавітыя карані, чарвякоў. Людзі кормяць свіней свежай травой, жалудамі, варанай бульбай.



Правообладатель Национальный институт образования

У корм дабаўляюць муку. Свіней утрымліваюць у **свінарніках**. У іх нараджаюцца парасяты. Людзі клапатліва даглядаюць свіней і парасят. Іх вырошчваюць дзеля смачнага і пажыўнага мяса, сала.

***Куры*** — свойскія птушкі. *(З апорай на малюнак назавіце часткі цела курыцы.)* Цела курэй буйное, цяжкае. Крылы кароткія. Таму яны дрэнна лятаюць. Дужымі, моцнымі нагамі куры разгортваюць смецце, зямлю. Так яны шукаюць чарвякоў, насякомых і іх лічынак. Куры скубуць траву, збіраюць насенне пустазелля. Гэтыя свойскія птушкі нясуць яйцы. З яец выводзяцца кураняты. У курэй смачныя мяса і яйцы.

Шмат гадоў таму назад свойскай жывёлы не было. Людзі здабывалі на паляванні мяса дзікіх звяроў і птушак. Часам яны прыносілі з сабой дзіцянят гэтых жывёл і клапаціліся пра іх. Малышы падрасталі, прывыкалі да людзей і станавіліся ручнымі. Так у гаспадарцы чалавека сталі жыць розныя жывёлы. У прыродзе і цяпер жывуць дзікія коні, кабаны, бараны, куры, качкі.

1. Замест кропак падбярыце словы, якія падыходзяць па сэнсе. Раскажыце, хто кім быў і кім стаў.

Цяля — ... . Жарабя — ... . Ягня — ... . Шчаня — ... . Парася — ... .



Правообладатель Национальный институт образования

2. Хто выводзіцца з яец? Складзіце сказы з прапанаванымі словамі.

З курыных … . З качыных … . З гусіных … . З індычыных … .

3. Складзіце сказы з пералікам. Чым бы вы накармілі свойскую жывёлу?

Сабаку … . Свінню … . Карову … . Каня … . Кошку … . Курэй … .

1. Прывядзіце прыклады свойскай жывёлы.
2. Для чаго людзі разводзяць свойскую жывёлу?
3*. Хто са свойскай жывёлы расліннаедны? Хто драпежнік? Хто ўсёедны?
4*. Раскажыце пра адну свойскую жывёліну (на выбар). Выкарыстоўвайце малюнкі на старонцы 37 і план на старонцы 29.

Разам з дарослымі вучыцеся даглядаць свойскую жывёлу (па магчымасці). Спрабуйце самі класці корм у кармушку, наліваць ваду ў паілку.

## Небяспечныя жывёлы: каго баяцца

Ці могуць жывёлы быць небяспечнымі для чалавека? Разгледзьце малюнкі. Чым небяспечна кожная з гэтых жывёл? Як гадзюку адрозніць ад іншых змей?

Джаліць.



Правообладатель Национальный институт образования



Аса



Гадзюка



Клешч



Бадзяжны сабака

Усе жывёлы важныя і патрэбныя прыродзе. Некаторыя з іх могуць быць небяспечнымі для чалавека. Напрыклад, насякомыя, якія джаляць: пчала, аса, чмель. Яны лятаюць у прыродзе ў цёплую пару года. Калі выпадкова прыцiснуць пчалу, асу або чмяля, то яны могуць уджаліць. У ранку трапляе яд. Месца ўкусу чырванее, баліць, свярбіць. Калі вас уджаліла насякомае, адразу паведаміце пра гэта дарослым. Трэба ранку прамыць і прыкласці да яе халодны прадмет.

Каб пазбегнуць укусаў, абыходзьце вуллі з пчоламі, гнёзды вос, чмялёў. Не хадзіце басанож па траве падчас яе цвіцення. Пчол, вос прыцягваюць садавіна, прысмакі. Таму не ешце іх на вуліцы. Не адмахвайцеся ад насякомых, а спакойна адыдзіце.

***Кляшчы*** жывуць у лясах, парках. Яны поўзаюць па траве, галінках кустоў. Калі кляшчы пападаюць на цела чалавека або жывёлы, то пракусваюць скуру і смокчуць кроў. Месца ўкусу чырванее, свярбіць. Кляшчы могуць



Правообладатель Национальный институт образования

заразіць здаровага чалавека небяспечнымі хваробамі.

***Памятайце!*** Летам у лесе, парку не сядайце і не кладзіцеся на траву. Адзенне павінна быць закрытым, з доўгімі рукавамі. Штаны трэба заправіць у боты або шкарпэткі. Не забудзьце надзець галаўны ўбор. Пасля прагулкі агледзьце адзенне і цела.

***Гадзюка*** — ядавітая змяя. Яна не нападае першай. Пры сустрэчы з чалавекам стараецца ўцячы. Калі на гадзюку выпадкова наступіць, то яна можа ўкусіць. Таму ў лесе трэба глядзець пад ногі. Для прагулак у лес апранайце доўгія штаны, абувайце высокія боты. Пры ўкусе гадзюкі трэба неадкладна звярнуцца да ўрача.

Небяспечнай для людзей можа быць і свойская жывёла. Карова, каза бадаюцца (колюць рагамі). Конь можа ўкусіць, ударыць нагой або абедзвюма заднімі нагамі. Гусі балюча шчыпаюць. Таму дзецям нельга падыходзіць да гэтых жывёл без дарослых.

Сабакі звычайна паводзяць сябе дружалюбна са сваімі гаспадарамі. З незнаёмымі людзьмі іх паводзіны мяняюцца. Сабака гучна брэша і можа напасці першым. Таму незнаёмую жывёлу лепш абысці. Не размахвайце рукамі. Не чапайце сабаку, калі ён есць або ахоўвае шчанюкоў. Нельга дражніць жывёлу і ўцякаць



Правообладатель Национальный институт образования

ад яе. Сабака можа пачаць паляванне і пагнацца за вамі.

Небяспечнымі бываюць бадзяжныя сабакі і каты. Іх не трэба чапаць рукамі, гладзіць. Пасля кантакту з жывёламі абавязкова мыйце рукі. Калі вас хтосьці з іх укусіць або падрапае, абавязкова скажыце дарослым.

Назавіце небяспечных для чалавека жывёл. Чым яны небяспечныя? Складзіце сказы з дадзенымі словамі.

**Хто?** Пчала, аса, чмель, клешч, сабака, гусь, кошка, карова, каза, конь.

**Што могуць рабіць?** Кусаць, драпаць, шчыпаць, пракусваць скуру, бадаць, біць нагой, калоць рагамі, джаліць, смактаць кроў.

1. Якія жывёлы могуць быць небяспечнымі для чалавека?

2. Чаму дзецям нельга падыходзіць да каровы? А да каня?

3*. У якіх выпадках сабака можа напасці на чалавека? Як гэтага пазбегнуць?

4*. Якія правілы бяспечных паводзін з жывёламі вам вядомы?

Даведайцеся ў дарослых, адкуль бяруцца бяздомныя каты і сабакі. Хто ім дапамагае? Што можаце зрабіць вы, каб дапамагчы бяздомным жывёлам?



Правообладатель Национальный институт образования

## Пагаворым пра жывёл. Разважайце, расказвайце

1. Дапоўніце схемы (вусна). Прывядзіце прыклады жывёл з кожнай групы.




2. З якіх частак складаецца цела насякомых? Рыб? Птушак? Звяроў?

3. Як называюцца жывёлы, у якіх цела пакрыта пер’ем? Шэрсцю?

4. Падбярыце жывёлам пары. Растлумачце свой выбар.

Матылёк, конь, ластаўка, голуб, карась, мядзведзь, пчала, шчупак.

5. Назавіце, што каму належыць.

Пёрка, луска, касмыль шэрсці.



Правообладатель Национальный институт образования

6. Пазнайце групы жывёл па апісаннях. Прывядзіце прыклады.

**Жывуць у вадзе. Маюць плаўнікі, жабры, луску.**

**Жывуць на сушы. Цела пакрыта пер'ем. Нос называецца дзюбай, дом — гняздом.**

**На целе ёсць насечкі. Шэсць ног.**

7. На якія дзве групы можна падзяліць гэтых жывёл?

**Сініца, мядзведзь, зязюля, лісіца, вавёрка, салавей.**

8. У пералічаных назвах жывёл выключыце лішняе. Растлумачце свой выбар.

**Вавёрка, мурашка, заяц, воўк.**
**Сініца, вожык, шпак, качка.**

9. Правядзіце гульню «Журналіст». Адзін з гульцоў — журналіст. Ён задае пытанні пра жывёл. Другія гульцы адказваюць на іх. За правільна пастаўленае пытанне і адказ залічвайце па 1 бале. Перамагае той, хто набярэ больш балаў. *(Журналісту і гульцам можна выкарыстоўваць тэкст.)*



Правообладатель Национальный институт образования

## ЧАЛАВЕК — ЧАСТКА ЖЫВОЙ ПРЫРОДЫ

### Клопат пра здароўе і бяспеку

! Ці трэба дзецям клапаціцца пра сваё здароўе і бяспеку? Чаму?

Апетыт, электрычны ток.

Кожны з вас жадае быць моцным, здаровым. Здаровыя дзеці хутка растуць, правільна развіваюцца. Маюць добры **апетыт**, спакойны сон. Яны добра вучацца, займаюцца спортам. Здаровы чалавек шмат чаго паспявае, лёгка спраўляецца з любой справай. Ён мае зносіны з сябрамі, цікава адпачывае. У яго зладжана працуюць сэрца, страўнік і іншыя органы. Здаровы чалавек добра выглядае, доўга жыве. Нездарма пры сустрэчы мы жадаем адно аднаму здароўя. Ніякія дарагія рэчы яго не заменяць.

За вашым здароўем сочаць бацькі, настаўнікі, выхавальнікі. Але лепш за ўсіх паклапаціцца пра яго можаце толькі вы самі. На здароўе шмат што ўплывае. Раскажыце, як вы клапоціцеся пра яго. Для гэтага адкажыце на пытанні.

- Ці мыеце вы рукі перад ядой, пасля прагулкі, наведвання туалета?
- Ці сочыце за чысцінёй пазногцяў?
- Ці чысціце зубы?



Правообладатель Национальный институт образования

- Ці бываеце на свежым паветры?
- Ці ясце агародніну, садавіну?
- Ці робіце раніцай зарадку?
- Ці доўга гледзіце тэлевізар, гуляеце ў камп’ютарныя гульні?
- Ці сочыце за паставай?

Калі на многія пытанні вы адказалі «не», то вам наўрад ці ўдасца быць здаровымі.

Пра здароўе трэба клапаціцца ўвесь час, а не ад выпадку да выпадку. За адзін раз здаровым не станеш. Многія з вас ведаюць правілы ўмацавання здароўя. Ведаюць, але не заўсёды выконваюць, таму што лянуюцца, забываюць, спяшаюцца. А часам кажуць сабе: «Пачну заўтра». На наступны дзень паўтараецца тое ж самае.

У навакольным свеце з небяспекай можна сутыкнуцца ў прыродзе, на вуліцы, у двары і нават у кватэры. Здавалася б, якая небяспека дома? Аднак яна ёсць. Трэба ведаць пра яе і ўмець пазбягаць.

Калі вы засталіся дома адны, не адчыняйце дзверы незнаёмым людзям. Не гуляйце





Правообладатель Национальный институт образования

з запалкамі. Ад агню можа здарыцца бяда. Небяспечныя месцы ў кватэры — гэта балконы, падаконнікі. Нельга высоўвацца з акна, звешвацца з балкона. Так можна зваліцца ўніз. Дома трэба быць асцярожнымі з разеткамі і правадамі. У іх — **э-лек-тры-чны ток**. На кухні акуратна абыходзьцеся з гарачай плітой, кіпячай вадой. Дзецям нельга чапаць і нюхаць невядомыя рэчывы.

***Памятайце!*** Нават самыя звычайныя рэчы могуць быць небяспечнымі. Здароўе і бяспека шмат у чым залежаць ад вашых паводзін.

1. Што азначае выраз *добры дзень*? У якіх выпадках людзі так гавораць? Назавіце іншыя варыянты прывітання і пажадання здароўя.

2. Прачытайце яшчэ раз пытанні пра здароўе на старонках 46, 47. Палічыце, на колькі з іх вы адказалі «так». Зрабіце вывад.

3. Якія памылкі дапусціў хлопчык?

Доктар прапісаў Мішу акуляры. Але хлопчык не заўсёды іх носіць. Сёння ён доўга гуляў у камп’ютарныя гульні. Потым лёг і пачаў чытаць кнігу. Вечарам сеў вячэраць і ўключыў тэлевізар.



Правообладатель Национальный институт образования

1. Хто клапоціцца пра ваша здароўе? Хто можа зрабіць гэта лепш за іншых?

2. Якія правілы ўмацавання здароўя вы ведаеце?

3*. Якія правілы бяспекі трэба выконваць дома? Выкарыстоўвайце малюнкі на старонцы 47.

4*. Растлумачце, чаму важна быць здаровым.

Абмяркуйце з дарослымі, якія прадметы могуць быць небяспечнымі дома. Падрыхтуйце паведамленне «Хатняя небяспека».

## Рэжым дня

Раскажыце, што вы робіце раніцай (днём, вечарам). Чым любіце займацца ў вольны час? Як бавіце час на свежым паветры?

Рэжым дня, гігіенічныя працэдуры.

Умацоўваць здароўе дапамагае выкананне **рэжыму дня** (глядзіце малюнкі на форзацы 1). Трэба прывучаць сябе рабіць усё ў адзін і той жа час. Напрыклад, класціся спаць і прачынацца, прымаць ежу, рыхтаваць урокі, адпачываць. Калі чалавек кладзецца спаць у пэўны час, то ён хутка засынае. Яго сон спакойны, працяглы. Раніцай ён лёгка ўстае, мае добры, бадзёры настрой. Малодшыя школьнікі павінны спаць 9-10 гадзін у суткі. Недасыпанне шкодзіць здароўю.



Правообладатель Национальный институт образования

У рэжым дня ўваходзяць ранішняя гімнастыка, **гі-гі-е-ні-чны-я працэдуры**. У яго таксама ўключаюць прагулкі, дапамогу бацькам у хатніх справах. Але асноўны абавязак школьнікаў — вучоба. Часам пасля ўрокаў можна адчуць сябе стомленым. Вучоба — гэта разумовая праца. Выконваць аднолькавыя дзеянні стомна. Таму ў школьным раскладзе адзін вучэбны прадмет змяняецца іншым. Вучні чытаюць, пішуць, малююць, займаюцца фізкультурай. Каб яны не стамляліся, падчас заняткаў ладзяцца фізкультхвілінкі. Паміж урокамі ёсць перапынкі. У гэты час можна выйсці з класа, пахадзіць, пагуляць.

***Памятайце!*** Для здароўя шкодна гадзінамі сядзець каля экрана тэлевізара, камп'ютара. Не трэба захапляцца гульнямі на мабільным тэлефоне, электронным планшэце. Гэтыя заняткі добрыя ў меру. У свой рэжым карысна ўключаць пешыя прагулкі, гульні на свежым паветры, чытанне кніг.

Урокі і перапынкі ў школе арганізуюць настаўнікі. Час пасля школьных заняткаў вы плануеце самі. Для ўмацавання здароўя важна чаргаваць працу з адпачынкам. Адразу пасля ўрокаў трэба паабедаць і адпачыць. Карысна пагуляць на свежым паветры. Затым можна



Правообладатель Национальный институт образования

выконваць дамашняе заданне. Пры падрыхтоўцы ўрокаў дома таксама патрэбны невялікія перапынкі.

Пасля выканання дамашняга задання дапамажыце дарослым па гаспадарцы ці займіцеся любімай справай.

1. Па малюнках на форзацы 1 вызначце, дзе ў рэжыме дня час для працы, а дзе — для адпачынку.

2. Хлопчыку часта не хапала часу, каб дапамагчы маці ў хатніх справах. Ён заўсёды казаў: «Я не паспеў». Што вы яму параіце?

3. Падумайце, чаму так бывае.

Калі раніцай пасля сну зрабіць зарадку, то работа пойдзе спарней.

Калі раніцай заслаць ложак, то настрой палепшыцца.

Калі дапамагчы маці прыгатаваць вячэру, то ежа будзе больш смачнай.

1. Што такое рэжым дня? Для адказу выкарыстоўвайце малюнкі на форзацы 1.

2. Якое значэнне для чалавека мае выкананне рэжыму дня?

3*. Ці звязана здароўе чалавека з яго рэжымам дня? Растлумачце як.

4*. Раскажыце пра свой рэжым дня. Ці змяняецца ён у выхадныя дні? Якія заняткі ў рэжыме дня вы лічыце галоўнымі, абавязковымі для выканання?

Разам з дарослымі складзіце свой рэжым дня.



Правообладатель Национальный институт образования

## Харчаванне і здароўе

Навошта чалавеку патрэбна ежа? Ці ўся ежа карысна для здароўя?

Вітаміны, алергія.

Чалавек не можа пражыць без ежы. Разам з ёй у арганізм трапляюць неабходныя для жыцця рэчывы. На працягу дня і падчас сну яны расходуюцца. Зра-схо-да-ва-ны-я рэчывы трэба пастаянна аднаўляць. Таму чалавек ужывае ежу некалькі разоў у дзень. Ён снедае, абедае, вячэрае. Дзецям ежа неабходна для росту і развіцця. Малодшым школьнікам рэкамендуецца есці 4 разы ў дзень.

Для здароўя важна правільнае і разнастайнае харчаванне. Кожны дзень трэба есці свежую агародніну, садавіну. У іх шмат **вітамінаў**. Адны вітаміны патрэбны для росту. Другія — для добрага зроку. Трэція — для




*Карысныя прадукты*




*Шкодныя прадукты*



Правообладатель Национальный институт образования

ўмацавання касцей. Асабліва важныя вітаміны зімой і вясной. У гэты час чалавек ужывае ў ежу мала свежага зялeніва.

У прадуктах змяшчаюцца розныя вітаміны. Морква і чарніцы паляпшаюць зрок. Капуста, парэчкі, лімон абараняюць ад прастуды. Калі нейкага вітаміну ў арганізме не хапае, то чалавек пачынае хварэць. Карысных рэчываў многа ў кашах, хлебе, малочных прадуктах, рыбе.

Што будзе, калі часта есці цукеркі, шакалад, тарты? Ад салодкага разбураюцца зубы, можа быць **алергія**. Значыць, есці прысмакі ў вялікай колькасці шкодна. Тлустыя, салёныя прадукты, каўбаса таксама некарысныя. Іх можна есці нячаста і ў невялікай колькасці. Шкодна харчавацца чыпсамі, піць салодкую газіроўку. Шкодзіць здароўю пераяданне. Ад таго, што і колькі чалавек з'ядае, залежыць маса цела.

Каб быць здаровым, харчуйцеся ў адзін і той жа час. Перад ядой абавязкова мыйце рукі з мылам. Ежу добра перажоўвайце, не спяшайцеся. Пры болі ў жываце паведамляйце дарослым.

1. Замяніце словазлучэнні іншымі словамі, якія падыходзяць па сэнсе.

Пюрэ з бульбы — … . Каша з рысу — … . Сок з фруктаў — … .



Правообладатель Национальный институт образования

2. Чаму так гавораць: «*Кожнаму патрэбны снеданне, абед і вячэра*»?

3. Скажыце, хто мае рацыю.

— Я люблю яблыкі. У іх шмат вітамінаў.

— Няпраўда. Я парэзаў увесь яблык і ніводнага вітаміну не знайшоў.

4. Растлумачце, чаму агародніну і садавіну трэба добра вымыць перад ядой. Як гэта зрабіць правільна?

1. Якія правілы харчавання трэба выконваць?

2. Разгледзьце малюнкі на старонцы 52. Якая ежа карысна для здароўя? Якія прадукты не прыносяць карысці? Закрыйце іх фішкамі белага колеру.

3*. Ці звязана здароўе чалавека з харчаваннем?

4*. Ці можна сказаць, што вы харчуецеся правільна? Што вам хацелася б дадаць у сваё меню?

Разам з дарослымі складзіце сваё меню на дзень.

## Зубы, іх догляд

Раскажыце, як вы даглядаеце зубы.

Эмаль.

Зубы вельмі важныя для чалавека. Імі мы адкусваем і перажоўваем ежу. Добра перажаваная ежа лепш засвойваецца арганізмам. Дрэн-



Правообладатель Национальный институт образования

на перажаваная — наносіць шкоду здароўю. Перажаваць ежу можна толькі здаровымі зубамі.

Зубы дапамагаюць выразна вымаўляць гукі мовы. Здаровыя зубы ўпрыгожваюць твар. Таму іх трэба берагчы.

Зубы добра абараняе слой белай **эма-лі.** Яна пры пе-ра-жоў-ван-ні ежы можа трэскацца. У расколіну трапляюць шкодныя мікробы. Яны размнажаюцца і разбураюць зуб. Пасля яды на зубах і паміж імі ўтвараецца налёт з рэшткаў ежы. Ён шкодзіць зубам. Яны пачынаюць балець.

Зубы трэба чысціць, каб захаваць іх здаровымі. Рабіце гэта штодня раніцай пасля снедання і вечарам перад сном. Карыстайцеся асабістай зубной шчоткай і дзіцячай пастай. Падчас чысткі верхніх зубоў шчотку накіроўвайце зверху ўніз. Так вы пазбавіцеся ад рэшткаў ежы, якія затрымаліся паміж зубамі. Пры чыстцы ніжніх зубоў шчотку вядзіце знізу ўверх. Чысціце зубы з вонкавага





Правообладатель Национальный институт образования

і ўнутранага бакоў. Затым прапаласкніце рот. Кожны раз перад чысткай зубоў і пасля яе мыйце шчотку.

Не грызіце арэхі, цвёрдыя цукеркі. Не калупайце ў зубах вострымі прадметамі. Часцей ешце сырыя агародніну і садавіну. Два разы ў год наведвайце зубнога ўрача. Своечасова лячыце хворыя зубы.

1. Чаму так кажуць: *«Здаровыя зубы здароўю лю́быя»*?

2. Што трэба зрабіць, каб пачысціць зубы? Назавіце па парадку дзеянні, якія трэба выканаць.

3. Раскажыце, як правільна даглядаць зубную шчотку.

1. Для чаго чалавеку патрэбны зубы?

2. Чаму трэба добра пераджоўваць ежу?

3*. Што карысна для зубоў, а што наносіць ім шкоду?

4*. Ці звязана здароўе чалавека са здароўем зубоў?

1. Павучыцеся чысціць зубы, паласкаць рот, выкарыстоўваючы атрыманыя на ўроку веды.

2. Разам з дарослымі складзіце памятку «Як правільна чысціць зубы». Нагадайце бацькам, што зубную шчотку трэба мяняць кожныя 3 месяцы.



Правообладатель Национальный институт образования

## Як папярэдзіць хваробы

Як вы клапоціцеся пра сваё здароўе восенню (зімой, вясной, летам)?

Прастудныя захворванні, інфекцыйныя хваробы, каранцін.

Каб расці здаровым, трэба ведаць, як не захварэць. У любую пару года чалавека падпільноўваюць **прастудныя захворванні**. Асабліва часта людзі прастуджваюцца восенню і вясной, у сырое надвор'е. У чалавека, які прастыў, з'яўляюцца насмарк, кашаль. У яго баліць горла, павышаецца тэмпература, чырванеюць і слязяцца вочы. Пры прастудзе знікае апетыт, з'яўляецца слабасць.

Каб не прастываць, трэба загартоўвацца. Гэтаму дапамагаюць прагулкі, рухавыя гульні, праца на свежым паветры ў любую пару года. Загартоўваюць душ, мыццё ног перад сном. Дапамагае ўмацаваць здароўе сонца. Толькі летам трэба засцерагаць галаву ад сонечных прамянёў. Пакрывайце яе панамай, лёгкай шапачкай, хусткай.

Здараецца, што чалавек заражаецца **інфекцыйнымі хваробамі**. Інфекцыя — гэта малюсенькія арганізмы. Іх нельга разгледзець вачыма. Гэтыя «невідзімкі» могуць пракрасціся



Правообладатель Национальный институт образования




ў наша цела і стаць прычынай грыпу, ангіны, каранавірусу і іншых хвароб.

Небяспечныя «невідзімкі» перамяшчаюцца ў паветры. Хворы чалавек дыхае, кашляе, чхае. Пры гэтым кропелькі сліны з інфекцыяй трапляюць у паветра. Здаровыя людзі ўдыхаюць яго. Ад аднаго хворага могуць заразіцца некалькі дзясяткаў, соцень і нават тысяч чалавек.

Шмат небяспечных «невідзімак» жыве ў глебе, забруджанай вадзе, паветры. Яны асядаюць на навакольных прадметах. Іх многа на ручках дзвярэй, кнопках ліфта, парэнчах у пад'ездзе. А колькі на брудных руках! Бо мы ўсё бяром рукамі. Апалосканне вадой не выдаляе з іх бруд. Небяспечныя арганізмы гінуць толькі ад цёплай вады і мыла.

Кожны з вас можа зменшыць небяспеку заражэння інфекцыямі. Для гэтага трэба выконваць простыя правілы.


Правообладатель Национальный институт образования

- Абавязкова мыйце рукі з мылам пасля наведвання грамадскіх месцаў.
- Не дакранайцеся бруднымі рукамі да твару, вачэй, губ.
- Рабіце вільготную ўборку памяшканняў, мыйце цацкі, працірайце мэблю.
- Калі вы захварэлі, паведаміце дарослым. Не выходзьце на вуліцу, не хадзіце ў школу, у госці. Пры кашлі, чханні прыкрывайце рот сурвэткай. Выкарыстаныя сурвэткі адразу выкідвайце. Карыстайцеся толькі сваім (асабістым) ручніком, посудам. Выконвайце ўсе парады ўрача.
- Ніколі не чапайце лекі ў хатняй аптэчцы. Не ўжывайце таблеткі без дазволу дарослых.

Падрыхтуйце паведамленне «Як уберагчыся ад прастуды?». Выберыце з прапанаваных варыянтаў паводзін правільныя.

Апранацца ў адпаведнасці з надвор'ем. Гуляць у прамоклых адзенні і абутку. Рабіць зарадку. Выконваць рэжым дня. Шмат рухацца. Займацца спортам. Мала гуляць на свежым паветры.

1. Чыстыя рукі: якія яны? Правядзіце эксперымент. Прыцісніце рукі да талеркі з мукой. Уявіце, што мука — гэта небяспечныя мікробы. Вазьміце



Правообладатель Национальный институт образования

ў рукі лінейку, пагуляйце з ёй. Ці засталася мука на лінейцы? Апаласніце рукі і лінейку вадой.

Ці змылася мука? Вымыйце рукі другі раз з мылам. Пры гэтым палічыце да 20. Зрабіце вывад, як правільна мыць рукі.

2. Падыхайце на люстэрка. Яно запацела? Падыхайце на яго праз павязку на твары. Запацела? Зрабіце вывад, чаму людзі носяць маскі. Навошта патрэбны **каранцін**?

3. Што трэба зрабіць, каб вымыць рукі? Назавіце па парадку дзеянні, якія трэба выканаць для гэтага.

1. Як можна захварэць?

2. Чым небяспечны інфекцыйныя хваробы?

3*. Як перадаецца інфекцыя? Для адказу выкарыстоўвайце малюнак на старонцы 58.

4*. Растлумачце, чаму людзі носяць маскі.

Абмяркуйце з бацькамі, дзе ў доме можа знаходзіцца інфекцыя. Дапамажыце выправіць сітуацыю. Разам з дарослымі складзіце памятку «Як правільна мыць рукі».

## Хто такія паразіты

Ці даводзілася вам чуць слова **«паразіт»**? Каго так называюць?

Паразіт, глісты, вошы.



Правообладатель Национальный институт образования

Слова «паразіт» — не лаянка, не мянушка. Так называюць арганізмы, якія жывуць за кошт іншых. Паразіты таксама частка прыроды. Яны жывуць у глебе, вадзе, паветры. Могуць сяліцца ўнутры нас, на нашай скуры.



У целе чалавека і жывёлы жывуць **глісты**. Гэта чарвякі-паразіты. Яны часта сустракаюцца ў дзяцей. Глісты бываюць розных памераў і вельмі шкодзяць здароўю. Чалавека нудзіць, у яго баляць жывот, галава. Ён моцна худнее, становіцца слабым, млявым, бледным. Пагаршаюцца памяць, увага. Заражэнне глістамі называюць хваробай брудных рук. Бо на брудных руках бывае больш за ўсё яец паразітаў. Яны збіраюцца пад пазногцямі. Праз нямытыя рукі глісты трапляюць у рот. Унутры цела з яец развіваюцца чарвякі.

***Памятайце!*** Заражэння глістамі можна пазбегнуць. Для гэтага трэба выконваць правілы асабістай гігіены.

- Без напамінаў мыйце рукі з мылам перад ядой. Абавязкова — пасля наведвання туалета, паездкі ў транспарце. Старанна мыйце рукі пасля работы ў агародзе, зносін са свойскай жывёлай. Падстрыгайце пазногці і сачыце за іх чысцінёй.



Правообладатель Национальный институт образования

- Ешце толькі вымытыя агародніну, садавіну.
- Не піце ваду з рэк, азёр, сажалак.
- Дапамагайце дарослым падтрымліваць чысціню ў кватэры.
- Засцерагайце прадукты ад мух. Яны пераносяць яйцы глістоў на сваіх лапках.



Паразітамі чалавека з’яўляюцца **вошы**. Яны жывуць у валасах, на адзенні, пасцельнай бялізне. Вошы сілкуюцца крывёй. Ад іх укусаў скура на галаве ўвесь час свярбіць.

Вошы хутка бегаюць. Яны перасяляюцца з адной галавы на другую праз адзенне, галаўныя ўборы, расчоскі.

***Памятайце!*** Каб не заразіцца вошамі трэба:

- 1-2 разы ў тыдзень мыць валасы цёплай вадой з шампунем.
- Сачыць за чысцінёй сваёй расчоскі.
- Не надзяваць чужыя галаўныя ўборы.
- Не карыстацца чужымі расчоскамі, шпількамі.
- Не выкарыстоўваць брудную пасцельную бялізну, ручнікі, адзенне.
- Калі ў вас свярбіць галава, скажыце пра гэта дарослым.



Правообладатель Национальный институт образования

1. Дзяўчынкі рыхтаваліся да свята. Яны расчэсвалі адна адну нечымі расчоскамі. У коскі ўпляталі нечыя стужачкі. На галовы прымяралі нечыя абручы. Расчоскі, стужачкі, абручы раз-пораз падалі на падлогу. Маці ўбачыла гэта і раззлавалася. Чаму? Што яна сказала дзяўчынкам?

2. Прадоўжыце пералік прадметаў асабістай гігіены.

Расчоска, ... .

3. Падрыхтуйце паведамленне аб тым, як правільна даглядаць валасы.

1. Як чалавек можа заразіцца глістамі?

2. Што вы зробіце, калі ў вас забаліць жывот? А калі свярбіць галава?

3*. Што трэба рабіць, каб не заразіцца глістамі? Вошамі?

4*. Назавіце прыметы заражэння глістамі (вошамі).

Прыгатуйце свежую моркву для ўжывання ў ежу. Як засцерагчы сябе ад заражэння глістамі ў гэтым выпадку?

## Чым карысны адпачынак на прыродзе. Чаго баяцца

Чым вы займаецеся ў вольны час? Ці любіце адпачываць на прыродзе?

Непагадзь, плоскаступнёвасць, ступня, падэшва.



Правообладатель Национальный институт образования



Прыроду і свежае паветра любяць усе. Прырода супакойвае, радуе, здзіўляе. Яна дапамагае загартоўванню, здымае стомленасць. Людзі адпачываюць на прыродзе ў цёплую і халодную пару года. Адпачынак на свежым паветры ўмацоўвае здароўе. Нездарма кажуць: «Хто пестуном расце, таго хвароба не абміне».

Адпачываць на прыродзе можна па-рознаму. Добра прайсціся з кошыкам па лесе ў пошуках грыбоў. Можна папрацаваць у садзе ці агародзе. А можна адправіцца на прагулку ў парк ці на лужок.

Адпачынак на прыродзе асабліва патрэбны школьнікам. Бо яны шмат часу сядзяць за партай. На свежым паветры карысна займацца спортам, рухавымі гульнямі. Падчас адпачынку на прыродзе дзеці даведваюцца шмат новага.



Правообладатель Национальный институт образования

***Памятайце!*** Дзецям можна адпачываць на прыродзе толькі з дарослымі. Бо ў ёй хаваецца небяспека. Гэта кляшчы, змеі, дзікія звяры і іншае. Падчас адпачынку трэба быць гатовымі да змянення надвор'я. Улетку сонечны дзень можа змяніцца ліўнем, градам, моцным ветрам. Бывае навальніца з маланкай і громам.

Пры першых прыметах **непагадзі** трэба ісці дадому. Можна схавацца ў найбліжэйшым будынку і перачакаць яе. У навальніцу трымайцеся як мага далей ад высокіх дрэў. Пазбягайце вады і адкрытага поля. Нельга бегаць, ездзіць на веласіпедзе, размаўляць па мабільным тэлефоне.

Адпачываючы на прыродзе, дзеці шмат рухаюцца. У многіх пачынаюць балець ногі. Дзеці хутка стамляюцца, жадаюць прысесці.

Адна з прычын болю ў нагах — **плоскаступнёвасць**. Чалавек з плоскай **ступнёй** абапіраецца на ўсю **падэшву**, калі стаіць ці рухаецца. Пры гэтым псуецца паходка, парушаецца пастава. Каб папярэдзіць плоскаступнёвасць, важна ўмацоўваць косці ступні. Для гэтага трэба выконваць спецыяльныя практыкаванні.





Правообладатель Национальный институт образования

Падрыхтуйце паведамленне «Здароўе нашых ног». Падбярыце сцвярджэнні, якія падыходзяць па сэнсе.

Каб ногі былі здаровыя, трэба … .
Каб ногі былі здаровыя, нельга … .

Мыць ногі кожны вечар. Абуваць чужы абутак. Падстрыгаць пазногці. Хадзіць у прамоклых шкарпэтках і абутку. Насіць абутак не свайго памеру. Штодня мяняць шкарпэткі, калготы. Хадзіць басанож там, дзе ёсць смецце. Своечасова лячыць мазалі. Улетку хадзіць басанож па траве, пяску. Увесь дзень хадзіць у гумовым абутку.

1. Чым карысны адпачынак на прыродзе?

2. Што такое плоскаступнёвасць? Пакажыце на малюнку на старонцы 65 і ў сябе ступню, падэшву.

3*. Якая небяспека можа падпільноўваць чалавека ў прыродзе? Як яе пазбегнуць?

4*. Ці здаровыя вашы ногі? Ці звязана здароўе чалавека са здароўем ног?

Праверце, ці няма ў вас плоскаступнёвасці. Для гэтага намачыце нагу ў вадзе або змажце яе тлустым крэмам. Пастаўце нагу на чысты ліст паперы. Разгледзьце свой след. Параўнайце яго з выявамі на старонцы 65. Якая ў вас ступня?



Правообладатель Национальный институт образования

## Пагаворым пра здароўе і бяспеку. Разважайце, расказвайце

1. Што для чалавека больш важна: багацце ці здароўе? Чаму?

2. Якія словы паказваюць на здаровага чалавека?

Сутулы, моцны, бледны, стройны, спрытны, нязграбны.

3. Што трэба рабіць, каб быць здаровым? Што рабіць нельга? Выберыце правільныя варыянты.

Есці карысную ежу. Выконваць рэжым дня. Загартоўваць свой арганізм. Грызці пазногці. Больш рухацца. Не праветрываць памяшканне. Выконваць правілы гігіены. Есці прысмакі. Рабіць зарадку. Доўга гуляць у гульні на мабільным тэлефоне. Чысціць зубы.

4. Выберыце карысныя для здароўя прадукты і напіткі.

Каша, рыба, чыпсы, морква, фруктовы сок, цукерка, кока-кола, яблык.

5. Якія парады вы дасце сябру, сяброўцы, каб яны былі здаровымі?

6. Правядзіце гульню «Можна ці нельга». Падзяліцеся на 2 каманды. Задавайце адно аднаму пытанні аб здароўі. За правільныя пытанне і адказ залічваюцца балы. Выйграе каманда, якая набярэ больш балаў. Можна выкарыстоўваць тэкст з задання 3.



Правообладатель Национальный институт образования

# ЧАЛАВЕК — ЧАСТКА ГРАМАДСТВА

## ЧАЛАВЕК-ПРАЦАЎНІК. ПРАВІЛЫ ПАВОДЗІН У ГРАМАДСКІХ МЕСЦАХ

### На будоўлі

Разгледзьце малюнкі на форзацы 2. Якія прафесіі вы ведаеце? Кім працуюць вашы бацькі? Кім вы хочаце стаць? Чаму?



*Муляр*



*Цясляр*



*Маляр*



*Сантэхнік*



*Электрык*



Правообладатель Национальный институт образования

Панэлі, цэмент, шыфер, падмурак.

У гарадах і вёсках людзі будуюць дамы. На будоўлю прывозяць розныя будаўнічыя матэрыялы. У сельскай мясцовасці звычайна будуюць з дрэва. Атрымліваюцца драўляныя дамы. Гарадскія дамы будуюць з цэглы, **панэлей**. Панэлі — гэта гатовыя часткі дома. Іх вырабляюць на заводах, а затым прывозяць на будоўлю. Краны паднімаюць панэлі. Рабочыя ўстанаўліваюць іх у патрэбнае месца. Для будаўніцтва выкарыстоўваюць бетонныя пліты, дошкі, шкло, пясок, **цэмент**, **шыфер**.

На будоўлях працуюць рабочыя розных спецыяльнасцей. Спачатку будаўнікі закладваюць у зямлі **пад-му-рак**. Гэта аснова дома. Потым муляры, мантажнікі ўзводзяць сцены. Страхары майструюць дах. Калі сцены і дах гатовы, цесляры ставяць аконныя рамы, дзверы, насцілаюць падлогу. Шкляры ўстаўляюць шкло. Тынкоўшчыкі і маляры выраўноўваюць і фарбуюць сцены, столі.

Сантэхнікі праводзяць у дом водаправод і ацяпленне. Электрыкі пракладваюць да кожнай кватэры электраправодку. Важна, каб усе працавалі зладжана, дружна. Тады атрымаецца пабудаваць дом хутка і якасна.



Правообладатель Национальный институт образования

Будаўніцтва — гэта цяжкая праца. Будаўнікі ўзводзяць жылыя дамы, дзіцячыя сады, школы, магазіны, паліклінікі. Асабліва цяжка будаваць шматпавярховыя будынкі. Без машын тут не абысціся. На будоўлях працуюць шматтонныя грузавікі, самазвалы, пад'ёмныя краны, эк-ска-ва-та-ры. Імі кіруюць вопытныя вадзіцелі, кранаўшчыкі, экс-ка-ва-тар-шчы-кі.

***Памятайце!*** Будаўнічая пляцоўка — небяспечнае месца. Тут выкапаны глыбокія ямы. Усюды ляжаць панэлі, цэгла, пліты, трубы. Нават малая неасцярожнасць — і можа здарыцца бяда. Пабочным людзям, і асабліва дзецям, знаходзіцца на будоўлі нельга. Для бяспекі будаўнічыя пляцоўкі агароджваюць.

1. Прачытайце пытанні. Прадоўжыце пералік.

Будуюць ш т о? Школы, ... .
Будуюць з ч а г о? З цэглы, ... .

2. Замяніце словазлучэнні іншымі словамі, якія падыходзяць па сэнсе.

Дом з панэлей — ... . Дом з цэглы — ... . Дом з дрэва — ... .

1 паверх — аднапавярховы. 2 паверхі — ... . 3 паверхі — ... . Шмат паверхаў — ... .



Правообладатель Национальный институт образования

3*. Падрыхтуйце паведамленне пра тое, як будуюць дом. Што робяць спачатку, што — пасля? Выкарыстоўвайце схемы і апорныя словы-дзеянні.

Будаўнікі → падмурак. Муляры → сцены. Страхары → дах. Цесляры → рамы, дзверы, падлога. Шкляры → шкло. Электрыкі → электраправодка. Тынкоўшчыкі, маляры → сцены, столі. Сантэхнікі → водаправод, ацяпленне.

Словы-дзеянні: *робяць, закладваюць, устаўляюць, узводзяць, укладваюць, майструюць, пракладваюць, фарбуюць, выраўноўваюць, праводзяць.*

4. Кожны чалавек з дзяцінства марыць выбраць цікавую прафесію. Уявіце, што вы сталі будаўнікамі. Што вы пабудавалі б у сваім горадзе (вёсцы)?

5. Навошта чалавеку патрэбны дом? Раскажыце пра свой дом (глядзіце план).

- Адрас дома.
- З чаго пабудаваны дом?
- Колькі паверхаў у доме?
- На якім паверсе вы жывяце?

1. З чаго будуюць дамы ў горадзе і вёсцы?

2. Хто працуе на будоўлі? Выкарыстоўвайце малюнкі на старонцы 68.

3*. Якія работы выконваюць будаўнікі? З якімі матэрыяламі яны працуюць?



Правообладатель Национальный институт образования

4*. Раскажыце пра важнасць і карысць працы будаўнікоў.

1. Паназірайце, як будуюцца дамы. Навучыцеся выразна вымаўляць словы: *эк-ска-ва-тар*, *эк-ска-ва-тар-шчык*.

2. Пабудуйце дом з дэталей канструктара. З чаго пачняце? Што зробіце потым?

## Праца гараджан на фабрыках і заводах

Назавіце навакольныя прадметы. Адкуль бяруцца рэчы, патрэбныя для жыцця, работы і вучобы? Ці зручныя яны? Што вы хацелі б у іх змяніць?

Вырабы, матэрыялы.

У кожным горадзе нашай краіны ёсць фабрыкі, заводы. Там працуюць рабочыя розных спецыяльнасцей. Сярод іх — ткачыхі, швачкі, токары, кавалі, слесары, зборшчыкі дэталей, зваршчыкі і іншыя.

На фабрыках, заводах вырабляюць розныя прадметы. Гэта мэбля, адзенне, абутак, посуд, аўтамабілі, трактары, тэлевізары, камп'ютары і многае іншае. Усё, што створана рукамі людзей, называюць **вырабамі** (рэчамі). Яны паляпшаюць наша жыццё. Ёсць рэчы для работы,



Правообладатель Национальный институт образования

вучобы, адпачынку (глядзіце форзац 2). Прыемна насіць моднае адзенне. Добра сядзець у зручным крэсле. З прыгожай талеркі і абед здаецца больш смачным. Людзі прыдумалі сабе памочнікаў. Гэта розныя прылады, прыборы, машыны. Яны могуць перавозіць грузы, мыць бялізну, посуд, выдаляць пыл.

Рэчы вырабляюць з розных **матэрыялаў**. Гэта могуць быць тканіна, метал, пластмаса, папера, шкло. Матэрыялы таксама вырабляюць на фабрыках і заводах.

У нашай краіне ёсць мэблевыя, ткацкія, цацачныя, папяровыя, дывановыя фабрыкі. Працуюць аўтамабільныя, цагляныя, шкляныя і іншыя заводы. Усе яны вырабляюць рэчы і матэрыялы, неабходныя жыхарам гарадоў і вёсак. Гатовая прадукцыя з фабрык і заводаў паступае ў магазіны. Там мы яе і набываем.

У кожную рэч укладзена праца многіх людзей. Напрыклад, токары выточваюць на станках дэталі. Зборшчыкі збіраюць з іх часткі вырабаў. Зваршчыкі злучаюць металічныя часткі пры дапамозе зварачнага апарата. Ткачыхі на ткацкіх фабрыках вырабляюць з нітак тканіны. Гатовыя тканіны фарбуюць у розныя колеры і адпраўляюць на швейныя фабрыкі. Там швачкі шыюць з іх адзенне.



Правообладатель Национальный институт образования

***Памятайце!*** Праца людзей узаемазвязана. Над вырабамі разам працуюць рабочыя розных спецыяльнасцей. Якасць вырабаў залежыць ад стараннасці, добрасумленнага стаўлення да справы. Трэба паважаць працу людзей, берагчы навакольныя прадметы.

Кожны матэрыял мае свае ўласцівасці. Метал трывалы, але цяжкі. Пластмаса лёгкая, але ломкая. Гэтыя ўласцівасці ўлічваюцца падчас вытворчасці вырабаў. Асаблівасці матэрыялу неабходна ведаць і для таго, каб правільна выкарыстоўваць і даглядаць рэчы. Напрыклад, папера камечыцца і рвецца. Таму трэба быць акуратнымі з кнігамі, сшыткамі. Шкло крохкае. Яно разбіваецца ад удару. Вострымі асколкамі шкла можна параніцца. Вырабы з металу награваюцца. Імі можна апячыся.

1. Назавіце як мага больш вырабаў, якія адносяцца да агульнага слова.

Абутак — гэта ... . Посуд — гэта ... . Адзенне — гэта ... .

2. Назавіце выраб (на выбар). Вызначце яго часткі, дэталі.

3. Разгледзьце малюнкі на форзацы 2. Падумайце, што з якога матэрыялу зроблена. Замяніце словазлучэнні іншымі словамі, якія падыходзяць па сэнсе.



Правообладатель Национальный институт образования

Туфлі са скуры — … . Сурвэтка з паперы — … . Ваза са шкла — … . Тканіна з лёну — … . Мяч з гумы — … .

4. Устанавіце сувязь паміж прапанаванымі словамі. Складзіце сказы па апорных парах слоў.

Чаравікі — фабрыка. Аловак — дрэва. Талерка — гліна. Цагліна — завод.

5. Ці ведаеце вы сябе? Уявіце, што вы сталі рабочымі. Якая прафесія вас прываблівае? Якія работы вы хацелі б выконваць? Чаму?

1. Хто працуе на фабрыках і заводах?

2. Чаму да навакольных прадметаў трэба ставіцца беражліва?

3*. Як вы разумееце выраз «*Рукі чалавека ствараюць цуды*»?

4*. Раскажыце пра важнасць і карысць працы рабочых на фабрыках і заводах.

Даведайцеся, якія фабрыкі і заводы ёсць у вашай мясцовасці. Што там вырабляюць? Разам з дарослымі пабывайце на адным з прадпрыемстваў (па магчымасці). Якую работу вам хацелася б выконваць? Чаму?

## Праца сельскіх жыхароў на палях

Раскажыце, чым вы снедалі сёння. З чаго былі прыгатаваны стравы? Як прадукты харчавання трапляюць да нас на стол?



Правообладатель Национальный институт образования

**Раслінаводства, хлебароб, элеватар, хлебабулачныя вырабы.**

Чалавек харчуецца раслінай і жывёльнай ежай. Раслінная ежа — гэта хлеб, крупы, бульба, агародніна, садавіна, цукар. Жывёльная ежа — мяса, яйкі, рыба, малако, тварог, сыр.

Раслінную ежу чалавек атрымлівае ад культурных раслін. Іх высаджваюць у агародах, садах, цяпліцах. Культурныя расліны вырошчваюць у асноўным сельскія жыхары. Яны засяваюць імі вялікія ўчасткі зямлі — палі. Людзі саджаюць расліны яшчэ і для таго, каб атрымліваць кармы для свойскай жывёлы. Дзякуючы працы сельскіх жыхароў у нас заўсёды ёсць хлеб, агародніна, садавіна, малочныя і мясныя прадукты.




*Раслінная ежа*




*Жывёльная ежа*



Правообладатель Национальный институт образования

У **раслінаводстве** працуюць людзі розных прафесій. Гэта агароднікі, садаводы, **хлебаробы** і іншыя. Яны добра ведаюць, калі трэба сеяць насенне, як даглядаць расліны, калі збіраць ураджай. У рабоце на палях людзям дапамагаюць магутныя трактары, камбайны, грузавікі і іншая тэхніка. Яе вырабляюць у гарадах на заводах і адпраўляюць у вёску. Значыць, праца гарадскіх і сельскіх жыхароў узаемазвязана. Частку работ па вырошчванні раслін людзі выконваюць уручную.

Наш галоўны прадукт харчавання — хлеб. Людзі ўжываюць яго кожны дзень, і ён не






Правообладатель Национальный институт образования

прыядаецца. Хлеб мы купляем у магазіне. А як ён трапляе туды? Спачатку вырошчваюць збожжа. Хлебаробы высейваюць на палях збожжавыя культуры — пшаніцу, жыта, ячмень. У полі людзі працуюць і ў холад, і ў дождж, і ў спякоту.

Трак-та-рыс-ты плугамі ўзворваюць зямлю, сеялкамі сеюць зерне. Усходы падкормліваюць, праполваюць, абараняюць ад хвароб і шкоднікаў. Спелы ўраджай убіраюць з палёў камбайнеры на камбайнах. Вадзіцелі на грузавіках вязуць збожжа на **элеватары** (глядзіце малюнак на старонцы 77), дзе яно захоўваецца. Мукамолы на мукамольных заводах мелюць зерне ў муку. Потым яе вязуць на хлебазаводы. Пекары замешваюць з мукі цеста і выпякаюць розныя **хлебабулачныя вырабы.** Іх развозяць у магазіны. Адтуль яны трапляюць да нас на абедзенны стол. Атрымліваецца, што за хлеб мы павінны дзякаваць многім людзям.

***Памятайце!*** Праца хлебаробаў не бывае лёгкай. Таму ставіцца да хлеба трэба беражліва. Калі купляць у невялікай колькасці, ён не прападзе. З чэрствага хлеба можна прыгатаваць смачныя грэнкі.



Правообладатель Национальный институт образования

1. Прадоўжыце пералік хлебабулачных вырабаў.

**Батон, ... .**

2. Каму падзякаваць за хлеб? Хто з рабочых што робіць? Як называюць людзей, якія вырошчваюць хлеб?

**Трактарыст, камбайнер, вадзіцель, мукамол, пекар.**

Вы расказалі пра аднаго трактарыста (пекара і г. д.). Раскажыце пра многіх.

3. Складзіце апавяданне «Як хлеб трапляе да нас на стол». Выкарыстоўвайце малюнак на старонцы 77 і ланцужкі слоў.

**Узараць → пасеяць → падкарміць → прапалоць → сабраць → захаваць.**
**Поле → элеватар → мукамольны завод → хлебазавод → магазін → абедзенны стол.**

4. Калі б вы сталі хлебаробамі, якія работы выконвалі б? Чаму?

?

1. Адкуль людзі атрымліваюць раслінныя прадукты харчавання?
2. Што робіце вы, каб хлеб не прападаў дарэмна?
3*. Як звязана праца сельскіх жыхароў з працай людзей у горадзе?
4*. Раскажыце пра важнасць і карысць працы хлебаробаў.



Правообладатель Национальный институт образования

1. Падрыхтуйце паведамленне «Прафесіі ў вёсцы».

2. Разам з дарослымі прыгатуйце грэнкі з чэрствага хлеба. Для гэтага нарэжце яго тонкімі лустачкамі. Намачыце ў малацэ. Абсмажце з абодвух бакоў на алеі. Гатовыя грэнкі можна пасыпаць цукрам.

## Хто такія жывёлаводы

Разгледзьце малюнкі на форзацы 2. Прачытайце схему. Хто займаецца развядзеннем свойскай жывёлы? Хто каго даглядае? Якую жывёлу вы хацелі б даглядаць?

Жывёлаводы

конюх

пастух

свінарка

даярка

птушніца

цялятніца

Ферма, птушкафабрыка, жывёлавод.

Свойскую жывёлу разводзяць для таго, каб атрымліваць мяса, малако, яйкі. Гэта жывёльная ежа. Козы, авечкі даюць яшчэ пух і воўну. З іх робяць ніткі. З нітак вяжуць цёплыя шкарпэткі, шалікі, кофты. Ад гусей, качак, курэй атрымліваюць пух, пер’е. Іх выкарыстоўваюць для напаўнення падушак, вырабу цёплых куртак, паліто. Коні дапамагаюць перавозіць грузы і людзей.



Правообладатель Национальный институт образования

Кароў, свіней утрымліваюць на буйных **фермах**. Курэй разводзяць на **птушкафабрыках**. Клапоцяцца аб жывёле **жывёлаводы**. Іх праца нялёгкая, але важная. Каб жывёла была здаровай, патрэбны правільны догляд — добры корм, вада. У памяшканні, дзе жыве жывёла, павінна быць чыста. За ўсім гэтым і сочаць жывёлаводы. Яны падрыхтоўваюць і раздаюць кармы, утрымліваюць у чысціні інвентар.

Жывёлаводам дапамагаюць розныя машыны, механізмы. Іх вырабляюць рабочыя на заводах у горадзе. Жывёлаводы забяспечваюць гараджан малаком, мясам, яйкамі. Так жыхары горада і вёскі дапамагаюць адно аднаму. Яны працуюць для ўсіх.

Атрыманыя на фермах малако і мяса перапрацоўваюць. З малака робяць смятану, тварог, сыр, сметанковае масла, ёгурт. З мяса вырабляюць каўбасу, вяндліну, сасіскі, катлеты. Малочныя і мясныя прадукты развозяць па магазінах. Адтуль яны трапляюць да нас на стол. Разнастайная ежа карысная для здароўя чалавека.

***Памятайце!*** Нельга есці дрэнна правараное мяса. Свежае вясковае малако перад ядой трэба пракіпяціць. Растлумачце, як гэта можна зрабіць.



Правообладатель Национальный институт образования

1. Прадоўжыце пералік.

Малочныя прадукты: сыр, ... .
Мясныя прадукты: катлета, ... .

2. Прачытайце пытанні. Складзіце сказы. Прадоўжыце пералік.

**Што было?** Малако.
**Чым стала?** Сырам, ..., ..., ... .
**Што было?** Мяса.
**Чым стала?** Сасіскамі, ..., ... .

3. Складзіце апавяданне «Адкуль да нас прыходзяць малочныя прадукты». Выкарыстоўвайце малюнак і ланцужок слоў.

Ферма → малочны завод → магазін.






Правообладатель Национальный институт образования

4. Ці хочаце вы стаць жывёлаводамі? Якіх жывёл вам хацелася б даглядаць? Чаму?

1. Якімі прадуктамі харчавання нас забяспечваюць жывёлаводы?

2. Хто даглядае свойскую жывёлу?

3*. Растлумачце, чаму праца жывёлаводаў вельмі патрэбная.

4*. Як звязана праца жывёлаводаў з працай людзей у горадзе?

Разам з дарослымі наведайце ферму (па магчымасці). Якіх жывёл там утрымліваюць? З якой мэтай?

## Магазіны. Дзе і што мы купляем

Навошта патрэбны магазіны? Якімі яны бываюць? Што такое тавар?

Тавары, універмаг,
гандлёвы цэнтр, гіпермаркет,
самаабслугоўванне, правілы этыкету.

У горадзе і вёсцы людзі ходзяць у магазіны. Там яны набываюць неабходныя **тавары**. Тавар — гэта тое, што прадаюць і купляюць. Магазіны маюць рознае прызначэнне. Іх можна пазнаць па шыльдах, вітрынах. У пра-дук-то-вых магазінах прадаюць прадукты: малако, мяса,



Правообладатель Национальный институт образования



рыбу, хлеб, агародніну і садавіну. У прам-та-вар-ных можна набыць адзенне, абутак, посуд, тканіны. Усё тое, што выраблена на фабрыках і заводах. У га-спа-дар-чых магазінах прадаюцца тавары для дома. Напрыклад, інструменты, шпалеры, фарбы, мыйныя сродкі.

Ёсць магазіны, якія гандлююць таварамі аднаго наймення. Гэта кніжныя, абутковыя, хлебныя, агародніннья. Бываюць магазіны тканін, адзення, мэблі, бытавой тэхнікі. Сучасныя буйныя магазіны называюць **універмагамі, гандлёвымі цэнтрамі**. У іх прадаюцца тавары розных найменняў. У вялікіх гарадах працуюць гіпермаркеты. Яны прапануюць вялізны выбар розных тавараў. Вопытныя кансультанты дапамагаюць пакупнікам парадамі.

У магазінах працуюць прадаўцы. Яны паказваюць тавар, пакуюць яго, атрымліваюць ад пакупнікоў грошы. У магазінах **самаабслугоўвання** людзі самі выбіраюць патрэбныя тавары. Складваюць іх у карзіну ці каляску, нясуць або вязуць да касы. Там расплачваюцца, а касір выдае чэк. Акрамя магазінаў, пакупкі можна зрабіць на рынках.



Правообладатель Национальный институт образования

***Памятайце!*** Магазіны, рынкі — гэта гра-мад-скі-я месцы. Значыць, яны для ўсіх. Знаходзячыся ў такім месцы, неабходна выконваць **правілы этыкету**. Так называюцца нормы паводзін і зносін у пры-сут-на-сці іншых людзей. Правілы этыкету прыдумалі для таго, каб аблегчыць жыццё чалавека ў грамадстве. Размаўляць у магазіне і на рынку трэба ветліва, спакойна. Нельга псаваць настрой іншым людзям. На жаль, не ва ўсіх бываюць добрыя намеры. Калі сутыкнецеся з грубіянствам, не спяшайцеся злавацца ў адказ.

Бацька паабяцаў купіць дачцэ фламастары. Яны пайшлі ў магазін. Дзяўчынка падбегла да прылаўка і закрычала: «Пакажыце гэта! Не, дайце лепш гэта! Тата купіць мне ўсё, што захачу». Аднак бацька ўзяў дачку за руку і павёў да выхаду. Дадому яны вярнуліся без пакупкі.

Як вы думаеце, чаму так зрабіў тата? Ці мела рацыю яго дачка?

Што такое магазін? Выберыце правільнае словазлучэнне. Складзіце з ім сказ.

Паказваюць кіно. Прадаюць розныя тавары. Рамантуюць абутак.



Правообладатель Национальный институт образования

Рэпецiруем паводзiны з дапамогай гульнi «У магазіне». Гульнявыя ролі: пакупнікі, прадаўцы, касір.

Як знайсці ў магазіне патрэбны аддзел? Што трэба зрабіць перад тым, як купіць тавар? Як сябе паводзіць, калі ў касу стаіць чарга? Як расплаціцца за тавар?

1. Дзе людзі купляюць прадукты харчавання?
2. Што прадаюць у прамтаварным магазіне?
3*. Растлумачце, чым адрозніваецца звычайны магазін ад гіпермаркета.
4*. Раскажыце пра магазіны самаабслугоўвання. Чаму іх так называюць?

Разам з дарослымі пабывайце ў адным з магазінаў. Самастойна зрабіце пакупку. Падрыхтуйце паведамленне «Якія бываюць магазіны».

## Дзе можна адпачыць у выхадны дзень

Раскажыце, што вы робіце ў выхадныя дні. Чым любіце займацца на вуліцы і дома ў вольны час?

Гардэроб, білецёр, апладысменты, фае.

Чалавеку патрэбны адпачынак ад работы, вучобы. Мы адпачываем кожны дзень, у выхадныя дні, падчас канікул, водпуску. Адпачываць можна па-рознаму. Вольны час



Правообладатель Национальный институт образования

пажадана бавіць з карысцю для здароўя. Пры добрым надвор'і можна пагуляць у рухавыя гульні на свежым паветры. У дрэннае надвор'е самы час заняцца маляваннем, лепкай, аплікацыяй. Паспрабуйце канстру-я-ваць, чытаць кнігу, слухаць музыку, глядзець тэлевізар. Можна пайсці ў парк, бібліятэку, тэатр, цырк ці музей. Без кніг, спектакляў, фільмаў наша жыццё было б нецікавым. Іх героі вучаць нас правільна жыць, дапамагаюць стаць больш добрымі, разумнымі.



Каб наведаць тэатр, трэба загадзя выбраць спектакль і купіць білет. У тэатр людзі прыгожа апранаюцца. Перш чым прайсці ў глядзельную залу, трэба зняць вопратку. Гледачы па чарзе здаюць свае рэчы ў **гардэроб**. Узамен ім выдаюць нумаркі. Побач з гардэробам ёсць люстэрка. Да яго падыходзяць і глядзяць, ці ў парадку знешні выгляд. Каля дзвярэй глядзельнай залы стаяць **білецёры**. Яны правяраюць білеты, паказваюць, куды праходзіць. У білетах пазначаны месцы.

У тэатры таксама ёсць правілы этыкету. Заняць сваё месца ў зале трэба да таго, як пачнецца спектакль. Падчас паказу нельга размаўляць. Неабходна адключыць мабільны



Правообладатель Национальный институт образования

тэлефон. Дзякаваць артыстам за добрую ігру прынята **ап-ла-дыс-мен-та-мі**. У перапынку можна спакойна выйсці ў **фае**. Пасля заканчэння спектакля гледачы ўручаюць артыстам кветкі. Артысты некалькі разоў выходзяць на сцэну, кланяюцца.

***Памятайце!*** Парк, бібліятэка, цырк, музей, тэатр — грамадскія месцы. На кожнае з іх распаўсюджваюцца пэўныя правілы этыкету. Галоўныя гавораць: стаўцеся да іншых так, як хочаце, каб ставіліся да вас. Не рабіце іншым таго, чаго не хочаце, каб рабілі вам. Дабро заўсёды вяртаецца дабром, а зло — пакараннем. Калі выконваць правілы этыкету ў грамадскіх месцах, то дабра вакол нас будзе больш.

1. Складзіце з літар словы. Што абазначае кожнае з іх?

м з й    т а р    ц р    б б і т к    к і а

у е    э т    ы к    і л я э а    н г

2. Што больш карысна для здароўя?

Глядзець тэлевізар. Займацца на камп’ютары. Гуляць на свежым паветры.



Правообладатель Национальный институт образования

Рэпецiруем паводзiны з дапамогай гульнi «У тэатры». Гульнявыя ролi: гардэробшчык, бiлецёр, дзяжурны па зале, артысты, гледачы.

1. Чым можна заняцца ў вольны час?

2. Прывядзiце прыклады грамадскiх месцаў. Чаму iх так называюць?

3*. Якiя правiлы этыкету трэба выконваць у тэатры?

4*. Перакажыце сваiмi словамi галоўныя правiлы этыкету.

Разам з дарослымi наведайце тэатр, цырк цi музей. Паназiрайце за дзеяннямi работнiкаў тэатра (цырка, музея) i гледачоў (наведвальнiкаў).

## У бiблiятэцы

Дзецi iшлi па вулiцы. На дзвярах аднаго з будынкаў яны заўважылi таблiчку «Дзiцячая бiблiятэка». Што азначае гэты надпiс?

> Бiблiятэка, чытач, бiблiятэкар, Нацыянальная бiблiятэка, правiлы для чытачоў.

**Бiблiятэка** — гэта месца беражлiвага захоўвання кнiг. Дзiцячая бiблiятэка — месца захоўвання кнiг для дзяцей. Але кнiгi ў бiблiятэцы не толькi захоўваюць. Iх выдаюць



Правообладатель Национальный институт образования



чытаць дома. Чалавека, які прыйшоў у бібліятэку, называюць **чы-та-чом**. Большую частку ведаў людзі атрымліваюць з кніг. Таму чытанне карысна і дзецям, і дарослым. Нездарма людзі кажуць: «Хто мала чытае, той мала ведае». Сёння многія захапляюцца камп'ютарам. Але дзеля гэтага не варта адкладваць цікавую кнігу. З ёй не бывае сумна. Чытанне кніг — добры адпачынак.

У бібліятэцы кнігі стаяць на паліцах роўнымі радамі. Радоў так многа, што можна заблудзіць. Але на дапамогу чытачу заўсёды прыйдзе **біб-лі-я-тэ-кар**. Ён ведае, на якой паліцы шукаць патрэбную кнігу. Кожная з іх займае сваё месца.У бібліятэцы на кожнага чытача заводзяць спецыяльную картку. У ёй адзначаюць, якія кнігі ён выбірае, а таксама дату іх вяртання. У дзіцячых бібліятэках для чытачоў часта ладзяць цікавыя святы.

У сталіцы нашай Радзімы горадзе Мінску пабудавана **Нацыянальная бібліятэка**. Яна самая вялікая ў краіне.

Дзеці арганізавалі ў класе бібліятэчку. Яны прынеслі з дому свае кнігі для часовага агульнага карыстання. Расставілі іх у шафе на паліцах. Побач з шафай паставілі стол і крэслы. Атрымаўся чытацкі куток. Выбралі



Правообладатель Национальный институт образования

бібліятэкара. Ён падтрымліваў парадак у чытацкім кутку. Дапамагаў выбраць кнігу, запісваў імёны і прозвішчы чытачоў. Дзеці выконвалі **правілы для чытачоў**. Кнігі бралі толькі чыстымі рукамі. У кнігах не загіналі старонкі. Пры неабходнасці падклейвалі кнігу. Вярталі кнігі ў прызначаны тэрмін. Расказвалі, аб чым прачыталі, што спадабалася.

Што такое бібліятэка? Выберыце правільнае словазлучэнне. Складзіце з ім сказ.

Магазін кніг. Месца захоўвання кніг. Чалавек, які выдае кнігі.

Рэпеціруем паводзіны з дапамогай гульні «У бібліятэцы». Гульнявыя ролі: чытачы, бібліятэкар.

1. Ці ёсць у вас дома кнігі? Хто іх чытае?
2. Якую кнігу вы зараз чытаеце? Назавіце яе аўтара. Што ў ёй цікавага?
3*. Раскажыце аб правілах чытачоў. Якія з іх вы выконваеце?
4*. Вы ходзіце ў бібліятэку? Раскажыце пра парадак абмену кніг.

Навучыцеся выразна вымаўляць словы: *біб-лі-я-тэ-ка*, *біб-лі-я-тэ-кар*. Наведайце школьную бібліятэку. Прапануйце бібліятэкару сваю дапамогу. Арганізуйце ў класе чытацкі куток.



Правообладатель Национальный институт образования

## Мы — пасажыры

! Для чаго патрэбны транспарт? Які ён бывае? Прачытайце схемы. Прывядзіце прыклады кожнага віду транспарту.

**Транспарт** → наземны, водны, паветраны, падземны

**Транспарт** → пасажырскі, грузавы, спецыяльны

**Транспарт** → асабісты, грамадскі

> Сцюардэса, экіпаж, капітан, пасажыр, поручань.

Хто працуе на транспарце? Аўтамабілямі, аўтобусамі кіруюць вадзіцелі (шафёры). Цягнікі па чыгунцы і ў метро вядуць машыністы. Праваднікі пасажырскага цягніка дапамагаюць пасажырам. Яны сочаць за парадкам у вагонах. Самалётам, верталётам кіруюць лётчыкі (пілоты). У салоне самалёта пасажыраў абслугоўвае **сцю-ар-дэ-са**. Групу людзей, якія



Правообладатель Национальный институт образования

працуюць на паветраным транспарце, называюць **экіпажам**. На водным транспарце (караблях, катарах) таксама ёсць экіпажы. Галоўны ў экіпажы — **капітан**.

У гарадах людзі ездзяць на аўтобусах, тралейбусах, трамваях, маршрутных таксі. Гэта гарадскі грамадскі транспарт. Для пасадкі і высадкі пасажыраў арганізаваны прыпынкі. Яны абазначаны спецыяльнымі паказальнікамі.

На прыпынках трэба выконваць правілы бяспекі.

- Чакаюць транспарт на пасадачнай пляцоўцы.
- Нельга выходзіць на праезную частку дарогі.
- Пачынаць пасадку можна толькі пасля поўнага спынення транспарту.
- Нельга заходзіць у транспарт з марожаным і іншай ежай у руках. Вы можаце запэцкаць адзенне каму-небудзь.



Вы ўвайшлі ў транспарт і сталі **пасажырамі**. Аплаціце праезд. Не стойце каля дзвярэй. Так вы будзеце перашкаджаць уваходзіць іншым людзям. Прайдзіце ў салон. Знайдзіце зручнае месца. Трымайцеся за поручань. У такім выпадку вы не ўпадзяце, калі вадзіцель затармозіць. Уступайце месца людзям сталага ўзросту і з інваліднасцю,





Правообладатель Национальный институт образования

пасажырам з дзецьмі. Да выхаду рыхтуйцеся загадзя. Пытайцеся ў тых, хто стаіць перад вамі, ці выходзяць яны. Прасіце дазволу прайсці ў пасажыраў, якія едуць далей. Акуратна абмінайце іх.

1. Прадоўжыце пералік.

**Што едзе?** Аўтобус, ... .
**Што плыве?** Лодка, ... .
**Што ляціць?** Самалёт, ... .

2. Хто чым кіруе? Выберыце правільны варыянт. Складзіце з гэтым словазлучэннем сказ.

Машыніст, вадзіцель, лётчык, капітан.
Аўтобус, тралейбус, цягнік, трамвай, карабель, маршрутнае таксі, самалёт.

Вы расказалі пра аднаго машыніста (лётчыка і г. д.). Раскажыце пра многіх.

3. Вымавіце назвы прафесій на транспарце разам з лікамі 1, 2, 5. Узгадніце словы.

4. Які транспарт можа выбраць любы маршрут? Чаму? Які транспарт ездзіць па пэўным маршруце? Чаму? Чым адрозніваецца тралейбус ад трамвая?

Рэпеціруем паводзіны з дапамогай гульні «Мы — пасажыры». Гульнявыя ролі: вадзіцель, пасажыры, кантралёр.

Як аплаціць праезд? Што трэба зрабіць, калі выпадкова вы кагосьці штурхнулі? Як уступіць месца?



Правообладатель Национальный институт образования

1. Назавіце прафесіі людзей, якія працуюць на транспарце.

2. Як вы даведваецеся аб тым, дзе прыпынак транспарту?

3*. Раскажыце, як трэба паводзіць сябе на прыпынках транспарту.

4*. Раскажыце аб правілах паводзін у транспарце.

Разам з дарослымі вызначце самую зручную і бяспечную дарогу ад дома да школы і са школы да дома. Падрыхтуйце паведамленне «Разнастайнасць транспарту».

## У паліклініцы, бальніцы

Вы адчулі сябе дрэнна. Да каго звернецеся па дапамогу?

Паліклініка, педыятр, аптэка.

Калі чалавек захварэў, ён можа звярнуцца ў **паліклініку**. Таксама туды ідуць, калі






Правообладатель Национальный институт образования

надыходзіць час агляду. Дзяцей, напрыклад, узважваюць, вымяраюць іх рост, правяраюць зрок, слухаюць сэрца, робяць прышчэпкі. Аглядае і лечыць дзяцей урач-**педыятр**. Так ён клапоціцца пра іх здароўе. У паліклініцы ёсць урачы іншых спе-цы-яль-нас-цей. На прыёме яны таксама аглядаюць пацыентаў, пры неабходнасці прызначаюць лячэнне.

Лекі людзі купляюць у **аптэцы** і прымаюць іх дома. Па назначэнні ўрача ў паліклініцы робяць уколы, праграванні, масаж.

Здараецца, што чалавек цяжка хварэе. У яго высокая тэмпература. У такіх выпадках урача выклікаюць дадому. Калі нехта атрымаў траўму ці атруціўся, тэлефануюць у хуткую дапамогу па нумары **103**. Калі захворванне сур'ёзнае, то пацыента на «хуткай» даставяць у бальніцу. Там ён будзе да таго часу, пакуль не паправіцца.

Акрамя ўрачоў, у паліклініках і бальніцах працуюць ме-ды-цын-скі-я сёстры, санітаркі. Праца медыцынскіх работнікаў вельмі важная. Бо яны дапамагаюць чалавеку паправіцца. Ад гэтых людзей часам залежыць жыццё хворага.

***Памятайце!*** Паліклініка — грамадскае месца. Прыходзіць туды трэба чыста апранутым. Каля рэгістратуры ці кабінета ўрача неабходна заняць месца ў чарзе. У кабінет урача нельга заходзіць у верхнім адзенні.



Правообладатель Национальный институт образования

У хлопчыка разбалеўся зуб. Маці павяла яго да зубнога ўрача. У кабінеце ўрача хлопчык заўпарціўся: «Не! Я не хачу лячыць зуб!» Доктар сказаў: «У мяне няма часу цябе ўгаворваць. Пасядзі пакуль у калідоры».

**Як вы лічыце, хлопчык мае рацыю?**

Рэпеціруем паводзіны з дапамогай гульні «У паліклініцы». Гульнявыя ролі: наведвальнікі, рэгістратар, урач, медсястра.

**Як вы звернецеся ў рэгістратуру? Якую інфармацыю пра сябе трэба ведаць, каб заказаць картку? Як знайсці патрэбны кабінет?**

1. Навошта людзі наведваюць паліклінікі?

2. У якіх выпадках людзей накіроўваюць у бальніцы?

3*. Што вы даведаліся аб прафесіі ўрача?

4*. Раскажыце пра важнасць і карысць працы медыцынскіх работнікаў.

Даведайцеся, ці працуе хто-небудзь з вашых блізкіх у паліклініцы або бальніцы. Распытайце іх пра работу. Раскажыце ў класе, пра што вы даведаліся.

## На пошце

Як называюць людзей, якія разносяць пісьмы па дамах? Дзе працуюць гэтыя людзі? Навошта патрэбна пошта?



Правообладатель Национальный институт образования




Аператар, паштальён, адрас, інтэрнэт, служба выратавання, індэкс, адрасат.

У кожным горадзе, пасёлку, вёсцы ёсць пошта. З яе адпраўляюць пісьмы, паштоўкі, пасылкі, тэ-ле-гра-мы. Там можна атрымаць тое, што даслалі вам. Паштовая сувязь дапамагае людзям падтрымліваць зносіны адно з адным. На пошце можна выпісаць газеты і часопісы, каб даведвацца навіны.

На пошце працуюць **аператары** сувязі, **паш-таль-ё-ны**. Аператары сувязі рыхтуюць пісьмы, пасылкі да адпраўлення ў розныя гарады. Паштальёны разбіраюць паштовыя адпраўленні, якія паступілі. Іх прывозяць на грузавіках, цягніках, самалётах, караблях з розных краін і гарадоў. Паштальёны сартуюць газеты, пісьмы.

На кожным паштовым адпраўленні ёсць **ад-рас**: горад, вуліца, нумары дома і кватэры.



Правообладатель Национальный институт образования

Паштальёны алоўкам пазначаюць адрасы на кожнай газеце, кожным часопісе. Потым яны кладуць пісьмы, паштоўкі, газеты, часопісы ў паштовыя сумкі і разносяць іх па дамах. Паштальёны раскладваюць усё ў паштовыя скрынкі. Каб атрымаць пасылку, людзі павінны самі ісці на пошту. Праца паштальёна цяжкая, але вельмі патрэбная.

Да сучасных сродкаў сувязі адносяцца тэлефоны, **інтэрнэт**. Па тэлефоне мы звязваемся з чалавекам з іншага горада ці краіны. Дамаўляемся з сябрамі схадзіць пагуляць ці пытаемся пра дамашняе заданне. Пры ўзнікненні небяспекі трэба тэлефанаваць у **службу выратавання**. З дапамогай інтэрнэту можна хутка даслаць паведамленне электроннай поштай.

Зручна карыстацца пераносным тэлефонам. Яго яшчэ называюць мабільным. Мабільны тэлефон можна ўсюды насіць з сабой. Гэта дазваляе быць на сувязі з блізкімі людзьмі ў любы час.

1. Рэпеціруем паводзіны з дапамогай гульні «Размова па тэлефоне».

Што трэба зрабіць, каб патэлефанаваць? Назавіце па парадку дзеянні, якія неабходна выканаць. З чаго пачынаюць размову? Чым заканчваюць? Якія словы выкарыстоўваюць для прывітання? Развітання? Падзякі? Выбачэння?



Правообладатель Национальный институт образования

2. Напішыце пісьмо маці ці бацьку. Пішыце літарамі або з дапамогай малюнкаў. Улажыце сваё пісьмо ў канверт з маркай. Напішыце на ім свой адрас і індэкс. Апусціце пісьмо ў паштовую скрынку на вуліцы.

1. Як людзі падтрымліваюць сувязь адно з адным?

2. Як пісьмы, паштоўкі, пасылкі трапляюць на пошту?

3*. Што вы даведаліся аб прафесіі аператара сувязі (паштальёна)?

4*. Раскажыце пра важнасць і карысць працы работнікаў пошты.

1. Правярайце свае паштовыя скрынкі. Ці дайшло ваша пісьмо да адрасата?

2. Разам з дарослымі наведайце бліжэйшую пошту. Паназірайце за дзеяннямі аператараў сувязі, паштальёнаў, наведвальнікаў.

## Дзе і што мы ядзім

Успомніце, якія прадукты карысны для здароўя дзяцей.

Сервіраваць, афіцыянт, меню, сталовыя прыборы.

Для жыцця чалавеку патрэбна разнастайная ежа. Яна павінна быць не толькі смачнай,



Правообладатель Национальный институт образования



але і карыснай. Правільнае харчаванне — гэта здароўе і добры настрой. Есці трэба некалькі разоў у дзень. Калі рабіць гэта нерэгулярна, можна захварэць. Ужываць лепш дамашнюю ежу. Звычайна дома гатуюць смачныя і карысныя стравы, напіткі. З агародніны робяць розныя салаты. З садавіны і ягад вараць кампоты, кісялі. Бацькі, бабулі і дзядулі клапоцяцца пра здароўе членаў сваёй сям'і. У выхадны дзень гатаваць абед можна разам.

Часам можна паесці ў кафэ, рэстаране. Там ёсць кухня, зала для наведвальнікаў. На кухні кухары гатуюць супы, салаты, кашы, мясныя і рыбныя стравы. У кафэ, рэстаране чыста і ўтульна. Сталы прыгожа **сер-ві-ра-ва-ны**. У зале працуюць **а-фі-цы-ян-ты**. Яны знаёмяць наведвальнікаў з меню. Потым запісваюць у блакнот заказ і прыносяць ежу. Наведвальнікі дзякуюць ім.



Правообладатель Национальный институт образования

***Памятайце!*** Кафэ, рэстаран — грамадскія месцы. Наведвальнікі павінны выконваць правілы этыкету за сталом. Вучыцеся і вы гэтым правілам.

- Есці трэба прыгожа і акуратна.
- Падчас яды не кладзіце локці на стол.
- Старайцеся есці бясшумна. Перажоўвайце ежу, не раскрываючы рота.
- Не раскідвайце крошкі. Не размаўляйце з поўным ротам.
- Калі вам трэба ўзяць што-небудзь, не цягніцеся цераз стол. Папрасіце перадаць.
- Падчас яды карыстайцеся сталовымі прыборамі — лыжкай, відэльцам, нажом.
- Губы выцірайце сурвэткай.
- Пасля яды дзякуйце таму, хто прыгатаваў і падаў ежу.

Прачытайце пытанні. Узгадніце словы. Складзіце з імі словазлучэнні.

**Ч ы м?** Набірае *(чарпак)*. Рэжа *(нож)*. Есць *(відэлец, лыжка)*. Выцірае *(сурвэтка)*.

**З ч а г о?** Лье *(шклянка)*. П’е *(кубак)*. Налівае *(збан, каструля)*.

Рэпеціруем паводзіны з дапамогай гульні «У кафэ». Гульнявыя ролі: афіцыянт, наведвальнікі.



Правообладатель Национальный институт образования

1. Хто клапоціцца пра ваша харчаванне дома (у школе)?

2. Прадстаўнікі якіх прафесій працуюць у кафэ (рэстаране)? Раскажыце пра важнасць і карысць іх працы.

3*. Ці ўплывае тое, што і як мы ядзім, на наша здароўе?

4*. Якія правілы культурных паводзін за сталом вы выконваеце без напамінаў? Якім правілам вам яшчэ трэба навучыцца?

Паспрабуйце сервіраваць стол да чаяпіцця (абеду). Вучыцеся карыстацца сталовымі прыборамі — лыжкай, відэльцам, нажом.

## Служба быту

Што вы будзеце рабіць, калі ў вас парвецца абутак? Як вы знойдзеце патрэбную майстэрню? З якімі словамі звернецеся да работніка майстэрні?

Паслугі, служба быту,
Дом быту, квітанцыя.

Жыхары гарадоў і вёсак часта карыстаюцца **паслугамі** розных майстэрань. Калі трэба пачысціць адзенне, паставіць набойкі на туфлі, вырабіць ключ, чалавек звяртаецца ў **службу быту**. Там працуюць розныя спецыялісты: швачкі, майстры па рамонце абутку, гадзіннікаў, бытавой тэхнікі і іншыя. Усе яны



Правообладатель Национальный институт образования




дапамагаюць вырашаць бытавыя праблемы. Яны «служаць» людзям: дапамагаюць нешта адрамантаваць, памыць, пачысціць. Адсюль і назва — служба быту.

Службу быту можна вызначыць па шыльдах, рэкламных шчытах з малюнкамі. Вы, напэўна, бачылі надпісы «Рамонт абутку», «Фота», «Хімчыстка» і іншыя. Нярэдка розныя майстэрні аб’ядноўваюць у адным будынку — **Доме быту**. Гэта вельмі зручна. Людзі могуць хутка вырашыць некалькі бытавых праблем у адным месцы. Напрыклад, заказаць ключ, здаць бялізну для мыцця, пастрыгчыся. Спецыяліста службы быту можна выклікаць дадому.

Трэба ведаць, як карыстацца паслугамі службы быту. Калі парваўся абутак, то звярніцеся ў майстэрню «Рамонт абутку». Прыёмшчык абутку аформіць заказ. Вы заплаціце грошы за рамонт і атрымаеце **квітанцыю**. Яе



Правообладатель Национальный институт образования

трэба абавязкова захаваць. Квітанцыя — гэта дакумент. Па ёй вы атрымаеце сваю рэч пасля таго, як майстар яе ад-ра-ман-ту-е.

***Памятайце!*** Служба быту прызначана для ўсіх людзей. Гэта грамадскае месца. Тут таксама трэба выконваць правілы этыкету. Напрыклад, заняць месца ў чарзе, калі яна ёсць. У размове з работнікамі будзьце ветлівымі. Рэчы, якія здаяце ў рамонт, павінны быць чыстымі.

1. Рэпеціруем паводзіны з дапамогай гульні «У Доме быту». Гульнявыя ролі: кліенты, прыёмшчыца.

2. Прадоўжыце пералік ветлівых слоў.

Добры дзень, … .

1. Навошта патрэбны розныя майстэрні?

2. Па малюнку на старонцы 104 вызначце, якія майстэрні знаходзяцца ў Доме быту.

3*. Хто працуе ў службе быту?

4*. Раскажыце пра важнасць і карысць працы работнікаў службы быту.

1. Разам з дарослымі наведайце службу быту ў сваім горадзе (вёсцы). Паназірайце за дзеяннямі прыёмшчыка, наведвальнікаў.

2. Даведайцеся, ці працуе хто-небудзь з вашых блізкіх у службе быту. Распытайце іх пра работу. Раскажыце ў класе, пра што вы даведаліся.



Правообладатель Национальный институт образования

## Пагаворым пра чалавека-працаўніка. Развважайце, расказвайце

1. Назавіце вядомыя вам прафесіі. Навошта нам так многа прафесій?

2. Хто працуе на будоўлі? У полі? На ферме? У паліклініцы? На транспарце?

3. Што вам вядома аб працы муляра (трактарыста, жывёлавода, урача, кухара)?

4. Раскажыце аб прафесіі сваёй маці ці бацькі.

5. Ці можна сказаць так: «Усе прафесіі патрэбны, усе прафесіі важныя»?

6. Кім вы хочаце быць, калі вырасцеце? Як вы рыхтуецеся да гэтага?

7. Якія грамадскія месцы вы наведваеце? Якія правілы этыкету выконваеце?

8. Падзяліцеся на пары. Правядзіце гульню «Хто што робіць». Адзін называе прафесію. Другі — чым займаецца чалавек гэтай прафесіі (ці наадварот).


Правообладатель Национальный институт образования

# ХАТНЯЯ І ШКОЛЬНАЯ ЭКАНОМІКА

## Што такое эканоміка

Што неабходна чалавеку для жыцця? Прадоўжыце пералік: *вада, паветра, прадукты харчавання, посуд, ... .*

Эканоміка, цана, здача.

Ваду, паветра, сонечнае святло і цяпло людзі атрымліваюць ад прыроды. Акрамя таго, яны маюць патрэбу ў прадуктах харчавання, адзенні, абутку, кнігах і многім іншым (форзац 2). Гэтыя і іншыя тавары людзі купляюць у магазінах, на рынках. Кожны чалавек карыстаецца паслугамі іншых людзей. *(Прыгадайце службу быту на малюнку на старонцы 104.)* Тавары і паслугі мы павінны аплачваць. Бо ў іх укладзена праца іншых людзей, на ўсё патрачаны матэрыялы. Атрымліваецца, чалавек аддае грошы ў абмен на тавары і паслугі. Грошы трэба расходаваць эканомна, па-гаспадарску. Так, каб іх на ўсё хапала. Для гэтага неабходна ведаць правілы вядзення га-спа-дар-кі. Хатнюю гаспадарку мае кожная сям'я. Гэта ўсё тое, што ёй належыць. Правілам вядзення гаспадаркі вучыць **эканоміка**.

Гаспадарка бывае не толькі хатняй. Сваю гаспадарку маюць кожны раён, горад, краіна.



Правообладатель Национальный институт образования

Гэта ўсё, што ім належыць: заводы, фабрыкі, фермы, магазіны, бальніцы, школы, транспарт. Таксама тое, што зроблена рукамі людзей на заводах і фабрыках. Усё гэта звязана паміж сабой і складае эканоміку раёна, горада ці краіны.

Кожны тавар мае сваю **цану**. Пра яе трэба даведацца, перш чым купіць тавар. Адна і тая ж рэч можа быць больш дарагой і больш таннай. Ад чаго залежыць цана тавару?

*Прыклад 1*. Камп'ютар даражэйшы за тэлефон. Чаму? Бо на выраб камп'ютара затрачана больш матэрыялаў і працы. Камп'ютар — больш складаная прылада.

*Прыклад 2*. Батон і торт прыгатавалі з пшанічнай мукі аднаго гатунку. Важаць яны прыкладна аднолькава. Але торт даражэйшы за батон. Чаму? Таму што ў торт дабаўлены прадукты, якіх няма ў батоне. Напрыклад, сметанковае масла, арэхі, шакалад. На афармленне і ўпакоўку торта затрачаны дадатковыя сродкі і намаганні людзей.

*Прыклад 3*. У адной скрыні бананы буйныя, спелыя. У іншай — такія ж буйныя, але счарнелыя, пераспелыя. Доўга захоўвацца яны не будуць. Гэтыя бананы больш танныя. Значыць, цана залежыць і ад якасці тавару.



Правообладатель Национальный институт образования

*Прыклад 4*. Прадаюцца яблыкі — адборныя, румяныя. Адны вырашчаны ў Беларусі, іншыя прывезены з Малдовы. Малдаўскія яблыкі больш дарагія. Чаму? На іх перавозку былі затрачаны грошы.

1. Прыдумайце і разыграйце сітуацыі «Прадавец і пакупнік». Гульнявыя ролі: прадаўцы, пакупнікі.

2. Вы хочаце купіць абутак. Адкажыце на пытанні прадаўца.

Якога памеру (фасону, колеру)? З якога матэрыялу? Па якой цане: дарагія ці танныя? Які абцас (высокі, нізкі, тонкі, тоўсты)?

Прапануйце свае пытанні.

3. Вы хочаце купіць шапачку. Апішыце яе прадаўцу. Выкарыстоўвайце словы: *сіняя*, *у палоску*, *у клетку*, *няяркай расфарбоўкі*, *цёплая*, *тонкая*.

Прыдумайце і разлічыце цану пакупкі і **здачу**.

1. Прывядзіце прыклады тавараў. Прывядзіце прыклады паслуг.

2. Чаму чалавек павінен аплачваць тавары? Паслугі?

3*. Растлумачце, ад чаго залежыць цана тавару? Прывядзіце прыклады.

4*. Чаму трэба эканомна, па-гаспадарску расходаваць грошы?

Папрасіце дарослых паказаць вам беларускія папяровыя грошы і манеты.



Правообладатель Национальный институт образования

## Эканоміка сям’і

Успомніце, што такое сям’я. Раскажыце пра сваю сям’ю. Ці абмяркоўваюць у вашай сям’і, як лепш расходаваць грошы?

Дабрабыт, зберажэнні, даходы, расходы.

Вы ўжо ведаеце, што кожная сям’я мае хатнюю гаспадарку. Ёю звычайна кіруюць дарослыя — бацькі. Прымаць удзел у вядзенні хатняй гаспадаркі павінны ўсе члены сям'і. У кожнага з іх свая роля. Нехта зарабляе грошы, нехта ходзіць у магазін, нехта мые посуд. Хатняя праца не менш важная, чым работа на заводзе ці будоўлі. Ад таго, як вядзецца хатняя гаспадарка, залежыць **да-бра-быт** сям’і.

Каб кіраваць гаспадаркай, трэба ўмець лічыць грошы. А гэта не так проста, як падаецца на першы погляд. Адкуль у сям’ю паступаюць грошы? Як яны расходуюцца? Адказы на гэтыя пытанні вам падкажуць схемы.

*Зарплата таты* →
*Дапамога мамы* →
*Стыпендыя сына* →
*Пенсія дзядулі* →
*Пенсія бабулі* →



*Даходы сям’і*



Правообладатель Национальный институт образования




*Расходы сям'і*

Кожная сям'я лічыць свае **даходы** і **расходы.** Лічыць трэба так, каб грошай хапала на абавязковыя патрэбы. Купіць адразу ўсё, што хочацца, атрымліваецца не заўсёды. Набыццё некаторых тавараў адкладваюць на нейкі тэрмін. Часта на дарагія рэчы грошы збіраюць пакрысе, на працягу некалькіх месяцаў. Добра, калі ў сям'і пасля абавязковых расходаў застаецца частка грошай. Іх адкладваюць на будучыню. **Зберажэнні** расходуюць тады, калі ўзнікае неабходнасць. Напрыклад, на лячэнне, нечаканую паездку і іншае.

Эканоміць грошы ў сям'і могуць і дзеці. Калі берагчы адзенне, абутак, мэблю, кнігі, не давядзецца купляць новыя рэчы. Трэба своечасова закрываць кран з вадой, выключаць святло. Так скароцяцца расходы на ваду і электрычнасць. Неабходна таксама дапамагаць дарослым даглядаць расліны ў агародзе, садзе. Гэта зменшыць расходы на харчаванне. А яшчэ нельга раскідацца грашыма. Не паддавайцеся кожнаму свайму жаданню.



Правообладатель Национальный институт образования

Не патрабуйце, каб вам набывалі тое, чаго раптам захацелася. Напрыклад, надзіманую цацку, якая хутка лопне. Або машынку, якая хутка надакучыць. Перад тым як нешта купіць, задайце сабе пытанні: ці можна абысціся без гэтага? Ці застануцца потым грошы на самае неабходнае?

1. Падрыхтуйце паведамленне «Як можна сэканоміць». Выкарыстоўвайце апорныя словы.

Вада, электрычнасць, рэчы, агародніна, садавіна.

Берагчы, вырошчваць, выключаць.

2. Ці давяраюць вам бацькі самастойна купляць што-небудзь у магазіне? Ці ўмееце вы эканомна расходаваць грошы? Як вы разумееце словазлучэнні *раскідацца грашыма, умець лічыць грошы*?

1. Адкуль сям'я атрымлівае даходы? Выкарыстоўвайце малюнак-схему на старонцы 110.

2. На што расходуюцца сямейныя грошы? Выкарыстоўвайце малюнак-схему на старонцы 111.

3*. Якія расходы вы лічыце абавязковымі? Чаму?

4*. Раскажыце, як вы дапамагаеце эканоміць сямейныя грошы.

1. Разам з дарослымі палічыце, колькі грошай расходуе ваша сям'я за месяц.

2. Дапамагайце дарослым весці ўлік паказанняў лічыльнікаў вады і электрычнасці.



Правообладатель Национальный институт образования

## Школьная эканоміка

Што такое школьная эканоміка? Ці можаце вы эканоміць школьныя грошы? Як?

Дзяржаўная школа, даплата.

Школа, як і сям'я, мае сваю гаспадарку, сваю эканоміку. Гаспадарка патрабуе пастаяннай увагі і клопату. Ёю трэба кіраваць.

У нашай краіне большасць дзяцей вучацца ў **дзяржаўных школах**. Навучанне там бясплатнае. Дзяржава выдзяляе школе грошы на тое, каб вучні маглі вучыцца, а настаўнікі — вучыць. За гэтыя грошы ў школу купляюць мэблю, кнігі, абсталяванне для спартзалы, майстэрань. За ацяпленне, ваду, электраэнергію, тэлефон таксама трэба плаціць.

Каб вучні маглі паесці, у кожнай школе працуе сталовая ці буфет. Для прыгатавання абедаў патрэбны прадукты, вада, электрычнасць. Каб прывезці прадукты, неабходны транспарт. Калі скласці ўсе расходы, то атрымаецца вялікая сума. Каб школьны абед не каштаваў надта дарага, дзяржава выдзяляе **даплату**. Значыць, школьнікі аплачваюць толькі частку кошту абедаў.

Нямала грошай ідзе на рамонт памяшканняў, спартыўных пляцовак. Грошы расходуюць на падтрыманне парадку на школьным двары,



Правообладатель Национальный институт образования

у будынку школы. У школе працуюць настаўнікі, выхавальнікі, дворнікі, медыцынскія і іншыя работнікі. За сваю працу яны атрымліваюць заробак. Усё гэта — школьныя расходы. Іх многа.

А вось школьных даходаў няшмат. Таму трэба эканоміць школьныя грошы. Вучні робяць свой уклад у гэта. Яны берагуць ваду, цяпло, электрычнасць. Дзяжураць па школе, сталовай. Самі прыбіраюць школьныя кабінеты, выконваюць нескладаны рамонт кніг, мэблі.

Беражлівае стаўленне да школьнай маёмасці таксама дапамагае эканоміць грошы. Бо змяншаюцца расходы на рамонт памяшканняў, набыццё новай мэблі, кніг.

Падумайце, чаму так кажуць: «Даход не бывае без клопату».

1. За чый кошт дзеці вучацца ў дзяржаўных школах?

2. Чаму школьнікі плацяць за абеды толькі частку іх кошту?

3*. Раскажыце аб расходах школы. Выкарыстоўвайце малюнак-схему.




*Расходы школы*



Правообладатель Национальный институт образования

4*. Які ўклад вы робіце ў эканомію школьных грошай?

Даведайцеся ў бібліятэкара, колькі грошай школа траціць на набыццё кніг.

## ПРАВЫ ДЗІЦЯЦІ

### Што такое правы чалавека

Што, па-вашаму, азначаюць словы «правы», «абавязкі»?

Грамадзяне, дзяржава, закон, Канстытуцыя, правы, абавязкі.

Мы жывём у Рэспубліцы Беларусь. Людзей, якія пастаянна пражываюць у краіне, называюць **грамадзянамі**. Кожны чалавек з'яўляецца грамадзянінам той ці іншай **дзяржавы**. Мы з вамі — грамадзяне Рэспублікі Беларусь.

Кожная дзяржава прымае **законы**. Гэта правілы, якія людзі абавязаны выконваць. Асноўны закон дзяржавы называецца **Кан-сты-ту-цы-яй**. У ёй запісаны **правы** і **абавязкі** ўсіх грамадзян. Дзень Канстытуцыі — дзяржаўнае свята. У нашай краіне яго адзначаюць 15 сакавіка.

Правы — гэта магчымасці. Асноўныя правы грамадзян — права на жыццё, адукацыю, працу, ахову здароўя. Значыць, людзі ў нашай краіне маюць магчымасць жыць, вучыцца,



Правообладатель Национальный институт образования




працаваць, лячыцца, адпачываць.

У Беларусі распрацаваны Закон «Аб правах дзіцяці». У ім сказана, што ўсе дзеці маюць роўныя правы (роўныя магчымасці). Кожнае дзіця мае права быць грамадзянінам краіны. У яго ёсць права на вучобу. Яно можа выбіраць, у якой школе вучыцца, якія гурткі і секцыі наведваць. У дзяцей ёсць права атрымаць прафесію, пражываць у сям'і, мець добрыя ўмовы для жыцця. У іх ёсць права на ахову здароўя, абарону ад гвалту, дапамогу.

Дарослыя шмат чаго робяць для дзяцей. Будуюць дзіцячыя сады, школы, бальніцы, спартыўныя залы. Ствараюць умовы для развіцця здольнасцей, умацавання здароўя дзяцей. На фабрыках і заводах вырабляюць тавары для адпачынку, вучобы, заняткаў спортам. Асаблівы клопат — самым маленькім і хворым дзецям.

У чалавека не бывае праў без абавязкаў. Абавязак — гэта тое, што трэба абавязкова выконваць. Тады іншыя людзі будуць прызнаваць вашы правы. Галоўны абавязак — выконваць законы, не парушаць правы іншых людзей. Школьнікі павінны старанна вучыцца, рыхтаваць сябе да працы ў будучыні. Дзеці абавязаны слухаць бацькоў, дапамагаць ім, клапаціцца пра іх. Абавязак чалавека — да-



Правообладатель Национальный институт образования

памагаць іншым. Успомніце: кожнаму з вас таксама нехта дапамагаў.

Людзі абавязаны берагчы і ахоўваць прыроду. Яны павінны выконваць правілы паводзін у грамадскіх месцах. Дарослыя і дзеці не маюць права грубіяніць, крыўдзіць іншых. Закон будзе на баку пакрыўджанага. Калі вас крыўдзяць, скажыце бацькам ці настаўніку.

1. Прачытайце сказы. Пра якія правы і абавязкі дзяцей нагадваюць гэтыя сітуацыі?

Пасля ўрокаў хлопчык займаецца ў секцыі футбола.

Дзяўчынка захварэла. Маці паклала яе ў ложак і выклікала ўрача.

Вучань адстаў у вучобе. Аднакласнікі смяяліся з яго няўдач, дражнілі яго.

2. Пра якія абавязкі дзяцей нагадваюць наступныя словы?

Паліваць, выціраць, прыбіраць, выносіць, мыць, хадзіць, клапаціцца.

1. Як называюць людзей, якія пастаянна пражываюць у краіне?

2. Што робіцца ў нашай краіне для дзяцей?

3*. Раскажыце, аб чым гаворыцца ў Законе «Аб правах дзіцяці». Выкарыстоўвайце малюнак на старонцы 116.

4*. Якія правы ёсць ва ўсіх дзяцей у нашай краіне? Якія абавязкі?



Правообладатель Национальный институт образования

## Пагаворым пра эканоміку і правы дзіцяці. Разважайце, расказвайце

1. Якую сітуацыю вы лічыце найлепшай? Зрабіце вывад. Для адказу выкарыстоўвайце апорныя словы: *даходы*, *расходы*, *большыя*, *меншыя*, *роўныя*.

Сямейныя даходы … за расходы. Сямейныя даходы … расходам. Сямейныя даходы … за расходы. Вывад: … не павінны перавышаць … .

2. Уявіце, што вам падарылі грошы. На што вы іх зрасходуеце? Чаму?

3. Чаму заўсёды і паўсюль трэба беражліва ставіцца да навакольных прадметаў?

4. Які ўдзел у эканоміцы сям'і (школы) можаце прыняць вы?

5. Ці можна карыстацца правамі, не выконваючы сваіх абавязкаў?

6. Правядзіце гульню «Падбяром слоўнік». Для гэтага станьце ў круг. Кожны з гульцоў павінен сказаць слова па тэме «Хатняя і школьная эканоміка». Вучань, які стаіць побач, паўтарае сказанае і дадае сваё слова. Перамагае той, хто збярэ большую колькасць слоў.



Правообладатель Национальный институт образования

**Серадзінская, В. Х.**
С32 Чалавек і свет : вучэб. дапаможнік для 3-га кл. спец. школ, спец. школ-інтэрнатаў з бел. мовай навучання і выхавання. У 2 ч. Ч. 2. / В. Х. Серадзінская. — Мінск : Нацыянальны інстытут адукацыі, 2022. — 120 с. : іл.
ISBN 978-985-893-250-3.

Вучэбны дапаможнік прызначаны для 3-га класа спецыяльных школ, спецыяльных школ-інтэрнатаў з беларускай мовай навучання і выхавання для вучняў з цяжкімі парушэннямі мовы, для вучняў з цяжкасцямі ў навучанні.

**УДК 502(075.2=161.3)-056.313**
**ББК 74.3**

Правообладатель Национальный институт образования

(Назва ўстановы адукацыі)

| Навучальны год | Імя і прозвішча вучня | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Адзнака вучню за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |


Вучэбнае выданне

**Серадзінская** Вольга Харытонаўна

# ЧАЛАВЕК І СВЕТ

Вучэбны дапаможнік для 3 класа
спецыяльных школ, спецыяльных школ-інтэрнатаў
з беларускай мовай навучання і выхавання

У дзвюх частках

Частка 2

Нач. рэдакцыйна-выдавецкага аддзела *С. П. Маляўка*
Рэдактар *І. М. Дабрыдзень*
Мастакі *К. А. Тукач, М. А. Рацько, В. М. Горбач*
Вокладка мастака *В. М. Горбач*
Мастацкі рэдактар *Н. В. Музычэнка*
Камп’ютарная вёрстка *І. У. Шутко*
Карэктары *Г. М. Мазіна, М. У. Колас, Н. В. Федарэнка*

Падпісана да друку 01.12.2022. Фармат 70×100/16. Папера афсетная.
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 9,72. Ул.-выд. арк. 4,15. Тыраж 575 экз. Заказ

Навукова-метадычная ўстанова «Нацыянальны інстытут адукацыі»
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Пасведчанне аб дзяржаўнай
рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/263 ад 02.04.2014. Вул. Караля, 16, 220004, г. Мінск

Адкрытае акцыянернае таварыства «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/3 ад 10.09.2018.
Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, г. Мінск


Правообладатель Национальный институт образования